

СКУЛЬПТУРЫ ІРЫНЫ РАМБАЛЬСКАЙ МС

НАРОДНЫ ТЭАТР З КРАСНАПОЛЬСКАЙ ДУШОЙ МС





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЧЭРВЕНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 118 (28734)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел УЦЮПІН, намеснік міністра эканомікі:**

*«З пачатку года ў якасці рэзідэнтаў беларускіх СЭЗ зарэгістраваныя 24 прадпрыемствы, якія маюць намер рэалізаваць праекты з сумарным аб'ёмам інвестыцый больш за $440 млн. Адметнай асаблівасцю дзейнасці прадпрыемстваў ва ўмовах СЭЗ з'яўляецца больш высокі ўзровень эфектыўнасці працы. У апошнія гады адзначаюцца тэндэнцыі павелічэння колькасці рэзідэнтаў і прыросту па аб'ёмах заяўленых імі інвестыцый пад рэалізацыю праектаў. Распрацаваны праект указа, які прадугледжвае змены межаў тэрыторый свабодных эканамічных зон, а таксама пашырэнне магчымасцяў па прыцягненні крыніц фінансавання для развіцця інфраструктуры СЭЗ. Дакумент знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці і ў найбліжэйшы час можа быць прыняты».*

# З НОВЫМ СТАДЫЁНАМ!



Фота БелТА.

«Яго багатая гісторыя напоўнена гучнымі і вялікімі імёнамі, яскравымі перамогамі, незабыўнымі момантамі саперніцтва куміраў розных пакаленняў», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Ён нагадаў, што стадыён быў упершыню адкрыты ў 1934 годзе і адразу стаў галоўным спартыўным аб'ектам краіны. «Падчас Вялікай Айчыннай арэна была поўнасцю знішчана. Для яе аднаўлення спатрэбіліся чатыры доўгія гады», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Асобным радком у гісторыі стадыёна Аляксандр Лукашэнка назваў Алімпіяду-80. Перад яе пачаткам спартыўная арэна перажыла маштабную рэканструкцыю, стала зручнай, умяшчальнай і прыгожай. А ў 1982 годзе нашы балельшчыкі былі тут сведкамі залатога сезона футбольнай каманды «Дынама-Мінск». «Вельмі шкада, што гэтыя часы адышлі ў нябыт. Я думаю, што цяперашняе пакаленне дынамаўцаў, яшчэ раз упэўніўшыся ва ўвазе дзяржавы да спорту, верне тую вялікую славу, якая павінна належаць дынамаўскаму клубу, таварыству «Дынама» і гэтаму легендарнаму стадыёну», — выказаў надзею кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

**Вечарам у чацвер легендарны стадыён «Дынама» пасля абнаўлення прыняў сваіх першых гледачоў. Спартыўная арэна, на якой барэц Аляксандр Мядзведзь запаліў агонь на Алімпіядзе-80 (дарэчы, чаша алімпійскага агню пасля рэканструкцыі захавалася), цяпер абсталявана па-сучаснаму і гатова прымаць спаборніцтвы высокага ўзроўню. Кіраўнік дзяржавы, Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўдзельнічаў у цырымоніі адкрыцця «Дынама».**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## КОРАТКА

- Чатыры новыя дзіцячыя садкі, кожны мінімум на 200 месцаў, будуць уведзены ў эксплуатацыю ў Астраўцы, Шчучыне, Навагрудку і Гродне да канца 2018 года.
- **Навучальны цэнтр па кіналогіі для дзяцей і моладзі адкрыўся ўчора ў Гомелі.**
- Жыхары Стоўбцаў адзначаць у найбліжэйшую суботу 425-годдзе свайго горада вялікім святам «Мае родныя Стоўбцы! Край гасцінны, прыгожы!».
- **У Віцебску па праспекце Будаўнікоў побач з гасцініцай «Лучоса» ўсталявалі манументальна-дэкаратыўную скульптуру пад такой жа назвай. Аўтар — Сяргей Сотнікаў.**



■ Фінансы

# ПАГРОЗ ДЛЯ РУБЛЯ НЕ ВІДАЦЬ



## З іншага боку, рэзкае паслабленне расійскай валюты можа пацягнуць за сабой і нашу

**Ці сапраўды небяспечны рост спажывецкага крэдытавання для нашай эканомікі? Чаго чакаць ад нацыянальнай валюты ў найбліжэйшыя месяцы? Па гэтых і іншых пытаннях у ходзе анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА выказаўся дырэктар ТАА «Альпары Еўразія» Аляксандр САБОДЗІН.**

### Якой будзе стаўка рэфінансавання ад Нацбанка?

Аляксандр Сабодзін пракаментаваў пытанне аб тым, што Нацыянальны банк сёлета асцярожна зніжае стаўку рэфінансавання ў параўнанні з мінулым годам. Тады гэты паказчык знізіўся з 18 % да 11 %.

Дырэктар «Альпары Еўразія» адзначыў, што Нацыянальны банк краіны асцярожны, і для гэтага ёсць прычыны. Бо летась інфляцыя ў гадавым вымярэнні актыўна зніжалася — з 9,5 % у студзені да 4,6 % у снежні. Потым у студзені бягучага года інфляцыя дадаткова скарацілася да 4,5 % у гадавым выражэнні, пасля чаго перайшла да росту і ў красавіку павялічылася да 5 %. Але ўжо ў маі, дзякуючы месячнай дэфляцыі, знізілася да гістарычнага мінімуму ў 4,4 %.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# З НОВЫМ СТАДЫЁНАМ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт адзначыў, што ўсімі рэстаўрацыйна-будаўнічымі работамі займаліся беларускія спецыялісты. Выкарыстоўваючы перадавыя тэхналогіі, яны ашчадна захавалі гістарычную аснову. Пры гэтым арэна з'явілася сучаснай і высокатэхналагічнай. «Сюды з гонарам можна запрасіць імянітых спартсменаў з усяго свету», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка і выказаў перакананасць, што стадыён стане родным домам для аматараў актыўнага адпачынку.



«Ужо заўтра (22 чэрвеня. — **Заўв. аўт.**) гэтыя бегавыя дарожкі, сектары для кідання і скачкоў апрабуюць найлепшыя атлеты Беларусі, Украіны, Балканскіх і Прыбалтыйскіх краін, — дадаў Прэзідэнт. — У 2019 годзе стадыён «Дынама» стане сэрцам другіх Еўрапейскіх гульняў — грандыёзнай падзеі для Беларусі і ўсёй спартыўнай грамадскасці. Тут пройдуць цырымонія адкрыцця і спаборніцтвы па каралеве спорту — лёгкай атлетыцы».

Кантынентальныя спаборніцтвы пачнуцца роўна праз год — 21 чэрвеня 2019-га. Прэзідэнт перадаў сімвалічны ключ ад стадыёна «Дынама» беларускім спартсменам і даў адваротны адлік да пачатку II Еўрапейскіх гульняў.



Учора на стадыёне прайшлі і першыя спартыўныя спаборніцтвы. Хлопчыкі і дзяўчаткі з розных рэгіёнаў — выхаванцы СДЮШАР па лёгкай атлетыцы — прабеглі эстафету 4х100 метраў. А на футбольным полі сышліся зборная каманда «Дынама-Мінск» і «Дынама-Брэст» і зборная клубаў чэмпіянату Беларусі.



**Надзея АНІСОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# РУХ У АБОДВУХ НАПРАМКАХ

**Беларусь заўсёды была добрым транзітным акном для ЕС, але зваротнай сувязі пакуль не відаць**

**Такое меркаванне выказаў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з еўракамісарам па еўрапейскай палітыцы суседства і перагаворах аб пашырэнні Еўрапейскага саюза Ёханесам Ханам.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: нягледзячы на цяжкасці, Беларусь ніколі не была перашкодай для прасоўвання Еўрасаюза на ўсход — у Расію, Кітай, Японію. Беларусь заўсёды была добрым транзітным акном для Еўрапейскага саюза, не было забарон з беларускага боку на перамяшчэнне тавараў, рабочай сілы, капіталу, развіццё бізнесу, дадаў ён.

«На жаль, спадар Хан, мы гэтага не бачым з боку Еўрапейскага саюза, — канстатаваў беларускі лідар. — Я хачу, каб вы разумелі: мы будзем настойваць на тым, каб Еўрапейскі саюз сапраўды гэтак адкрываўся для нас, як мы адкрыты для вас».

На думку кіраўніка дзяржавы, гэта галоўная праблема і галоўнае пытанне, таму што эканоміка, гандлёва-эканамічныя адносіны, свабода ў шырокім сэнсе слова, пра якую дбае Еўрасаюз, — гэта асноўныя прынцыпы, на якіх грунтуецца тая ці іншая дзяржава.

Прэзідэнт таксама дадаў, што на цяперашні момант беларускі бок рыхтуе дакументы партнёрства з ЕС. «Не проста размовы пра дэмакратыю, свабоду слова, палітзняволеных, адмену смяротнага пакарання — гэта само сабой, мы не здымаем гэта з парадку дня, мы смела і адкрыта пра гэта кажам, — нагадаў еўрапейскаму прадстаўніку беларускі лідар. — Але асновай з'яўляюцца нашы гандлёва-эканамічныя, фінансавыя адносіны. Калі мы будзем бачыць у адносінах з Еўрапейскім саюзам гэта, то можам смялей ісці і на трансфармацыю, рэфармаванне нашага палітычнага ладу».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі нешта трансфармаваць, то ўсё разам — паступова і плаўна, не забываючы пра эканоміку і жыцці людзей. У якасці прыкладу падобнай палітыкі Прэзідэнт назваў «Усходняе партнёрства» — і няхай удзел Беларусі ў ім падабаецца не ўсім, аднак беларускі бок строга прытрымліваецца лініі дамоўленасцяў. Чаму наша краіна ідзе на супрацоўніцтва ў рамках «Усходняга партнёрства»? Таму што Беларусь прапануе канкрэтныя рэгіянальныя эканамічныя праекты, патрэбныя як Еўрасаюзу, нашай краіне, так і ўсходнім суседзям.

Акрамя таго, Прэзідэнт падзякаваў еўракамісару за ўдзел у палітычным і эканамічным развіцці Беларусі і адзначыў, што яго роля значная перш за ўсё таму, што асноўныя партнёры нашай краіны — ЕС і Расія. На яго думку, тое, што ў нас працягваецца нармалізацыя адносін з ЕС, якія, напэўна, ужо выйшлі на нейкі ўзровень стабільнасці, — гэта велізарная заслуга Ёханеса Хана.

«Выбудоўваючы нашы адносіны з Еўрапейскім саюзам — а гэта, мы ні ад кога не ўтойваем, наш найбліжэйшы сусед, а з суседзямі, паколькі яны ад Бога, трэба сябраваць і выбудоўваць партнёрскія адносіны, — выбудоўваючы гэтыя адносіны, мы ні ў якім разе не спяшаліся, не абяцалі вам таго, што не можам зрабіць», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ў сілу трансфармацый, якія адбываюцца ў Беларусі і ЕС, бакі прыйшлі да высновы, што «няздобра нам глядзець адно на аднаго праз агароджу і жыць скоса гледзячы адно на аднаго». Кіраўнік дзяржавы таксама нагадаў, што бакі вырашылі ісці насустрач, аднаўляць сяброўскія і партнёрскія адносіны.

«Мы не прасіліся ў Еўрасаюз, — падкрэсліў беларускі лідар. — Напэўна, гэта абсурдна, нерэальна, але мы хацелі б, каб у нас з Еўрапейскім саюзам былі такія адносіны, якім бы можа быць пазайздросцілі нават члены ЕС. І калі Еўрапейскі саюз на гэта гатовы — мы свой шлях гатовыя прайсці».

«Мы з вамі як вопытныя палітыкі выдатна разумеем, што лепш апярэджваць нейкія падзеі, лепш самім аднаўляць і ўстанаўліваць цесныя і добрыя адносіны. Горш, калі гэта адбываецца пад ціскам нейкіх абставін, нейкіх падзей, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму нам трэба мэтанакіравана, смела і адкрыта ісці насустрач адно аднаму. Без ціску абставін — вы разумееце, пра што ідзе гаворка».

Ёханес Хан цалкам пагадзіўся з тым, што за апошнія гады бакам удалося выбудаваць даверныя адносіны, паколькі толькі на такой аснове магчыма дасягнуць чагосьці канкрэтнага ў інтарэсах грамадзян.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### КІТАЙ ПЕРАСЦЯРОГ ЗША АД ВЫКАРЫСТАННЯ «МЕТАДУ ДУБІНКІ»



Прадстаўнік Міністэрства камерцыі КНР Гаа Фэн заявіў, што выкарыстанне ЗША «метаду дубінкі» бескарыснае ў перагаворах з Кітаем. Пра гэта паведамляе РІА «Навіны». «Падобныя ірацыянальныя паводзіны не могуць вырашыць праблемы», — сказаў Гаа Фэн. Ён таксама дадаў, што кітайскі бок лічыць канструктыўнымі і пазітыўнымі вынікі праведзеных кансультацый з ЗША. Аднак, паводле яго слоў, выклікае глыбокае шкадаванне той факт, што Штаты непаслядоўныя ў сваёй пазіцыі і зноў ініцыюючь гандлёвую вайну. Раней міністр камерцыі КНР Чжун Шань паведаміў, што ўлады ЗША прымалі «тэмпераментныя» рашэнні па пытаннях двухбаковага гандлю.

### ІРАН АДМОВІЎСЯ АД УДЗЕЛУ Ў СУСТРЭЧЫ АПЕК+

Іран не будзе прысутнічаць на сустрэчы краін — вытворцаў нафты АПЕК+ 23 чэрвеня ў Вене. Міністр нафты гэтай краіны Біджан Намдар Зангане мае намер адбыць сёння на радзіму пасля завяршэння сустрэчы з прадстаўнікамі краін — членаў АПЕК. Інфармацыю перадае агенцтва Reuters. Адзначаецца, што прадстаўнікі АПЕК+ плануюць разгледзець пытанне часовага павелічэння здабычы сыравіны ў рамках пагаднення. «Рынак цяпер палітызаваны прэзідэнтам Трампам. Я хачу дэклараваць, што АПЕК — гэта незалежная арганізацыя, якая не павінна выконваць інструкцыі ад прэзідэнта Трампа», — растлумачыў сваю пазіцыю Зангане.

### ПРЭЗІДЭНТ ВЕНЕСУЭЛЫ ПАДНЯЎ МІНІМАЛЬНУЮ ЗАРПЛАТУ ДА $1,85

Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура павялічыў мінімальную заработную плату ў краіне да 3 млн балівараў, з улікам дадатковых выплат на куплю мінімальнага прадуктовага кошыка яна складзе 5,2 млн балівараў, што прыкладна роўна $1,85. Пра гэта паведамляе нацыянальнае агенцтва навін AVN. «Работнікі будуць атрымліваць мінімальны даход у памеры 5 млн 196 тыс. балівараў. Агульны рост — на 103 працэнты», — заявіў Мадура. Апошні раз кіраўнік Венесуэлы падымаў заробак у краіне ў красавіку, аднак яго рост не паўплываў на пакупную здольнасць з-за гіперінфляцыі: толькі ў маі інфляцыя ў краіне перавысіла 24 500 працэнтаў у гадавым вылічэнні.

### ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР НОВАЙ ЗЕЛАНДЫІ НАРАДЗІЛА ДАЧКУ



Прэм'ер-міністр Новай Зеландыі 37-гадовая Джасінда Ардэрн упершыню стала маці — яна нарадзіла дзяўчынку, паведамляе New Zealand Herald. Гэта першае дзіця Ардэрн і яе мужа, вядучага папулярнай новазеландскай тэлеперадачы пра рыбалку (Fish of the Day) Кларка Гейфарда. Кіраўніца ўрада ўжо размясціла ў «Інстаграме» фатаграфію з дачкой, вага якой пры нараджэнні склала 3,31 кг. Яна падзякавала ўсім за добрыя пажаданні і дабрыню ў адносінах да яе сям'і. На здымку шчаслівая ўсміхаецца і навасьпечаны бацька. Джасінда Ардэрн адзначыла, што дзяўчынка здаровая і ў іх усё добра дзякуючы выдатнай камандзе клінікі. Гэта другі ў гісторыі выпадак, калі жанчына — дзейны кіраўнік урада — нараджае дзіця. Першай была прэм'ер-міністр Пакістана Беназір Бхута, якая ў 1990 годзе нарадзіла дачку, займаючы адказную пасаду. Па даных прэсы, на найбліжэйшыя шэсць тыдняў Ардэрн пайшла ў адпачынак па доглядзе дзіцяці. Абавязкі кіраўніка ўрада Новай Зеландыі ў гэты час будзе выконваць віцэ-прэм'ер, міністр замежных спраў Уінстан Пітэрс.

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ!

***Заўтра ў рэгіёнах пройдуць ужо традыцыйныя прамыя лініі.***

23 чэрвеня з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ, тэл. 80162213121;

намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Віктар Віталевіч АСКЕРКА, тэл. 80212222222;

першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ, тэл. 80232331237;

намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ, тэл. 80152735644;

намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ, тэл. 80222501869;

намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ, тэл. 80175004160;

старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК, тэл. 80172224444.

■ Дыялог бізнесаў

# КІТАЙ АДКРЫЎ НОВАЕ АКНО Ў ЕЎРОПУ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ

**Чакаецца, што новы маршрут дазволіць істотна паскорыць грузавыя перавозкі і стымуляваць развіццё экспартных магчымасцяў бізнесу**

**Паміж Беларуссю і Кітаем з'явіўся новы чыгуначны маршрут грузавых зносін. Першы цягнік з 38 кантэйнерамі з акругі Шыцзячжуан кітайскай правінцыі Хэбэй прыбыў на тэрмінал Калядзічы, што знаходзіцца пад Мінскам. Гэты раз таварны састаў пакіне свой груз у Беларусі, аднак у найбліжэйшай будучыні новы лагістычны ланцужок дазволіць паскорыць абмен прамысловымі таварамі паміж Кітаем і краінамі Еўропы.**


Фота БелТА.

Паводле слоў **першага намесніка начальніка Беларускай чыгункі Ігара ШЫЛАВА** чыгуначныя перавозкі з Кітаем зараз імкліва растуць.

«Сёлета мы плануем правесці праз беларускую чыгунку больш за 4 тысячы кантэйнерных цягнікоў з Кітая ў Еўропу, у тым ліку і ў нашу краіну і назад», — адзначыў падчас цырымоніі адкрыцця новага маршруту Ігар Шылаў.

Таксама плануецца, што новы шлях стымулюе беларускіх бізнесменаў пашыраць свой экспартны патэнцыял.

«БЧ сумесна з China Merchants Group, лагістычнымі аператарамі, партнёрамі і перавозчыкамі ствараюць усе неабходныя ўмовы для беспрашкоднага грузавога абароту тавараў. Сёння няма праблем для перамяшчэння беларускіх тавараў у 12 правінцый Кітая, як і няма праблемы па перамяшчэнні кітайскіх тавараў у Беларусь. Мы чакаем рэакцыі беларускага і кітайскага бізнесу: умовы створаны», — канстатаваў першы намеснік начальніка БЧ.

Як адзначыў **генеральны дырэктар прадпрыемства «Белінтэртранс — транспартна-лагістычны цэнтр» Яўген УСЯНКОЎ**, пасля сустрэчы першага цягніка плануецца правесці рэкламную кампанію, каб прыцягнуць бізнес. Чакаецца, што ў месяц магчыма будзе адпраўляць 3-4 цягнікі з правінцыі Хэбэй.

«У асноўным па новым маршруце будуць перавозіць тавары прамысловага прызначэння. У далейшым плануецца наладзіць дастаўку кітайскіх грузаў да Еўропы, краін Балтыі і СНД», — растлумачыў Яўген Усянкоў.

Акрамя таго, паводле яго ацэнак, чыгуначны транспарт робіць перавозку грузаў таннейшай у 10 разоў у параўнанні з авіяцыяй. Важная перавага выкарыстання чыгункі — і ў тэрміне дастаўкі. Сёння цягнік па новым маршруце зможа дастаўляць грузы за 14 дзён. Напрыклад, калі везці тавары праз Клайпедскі порт, то тэрмін можа павялічыцца ў 3-4 разы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Надвор'е

# Істотна пахаладае на фоне моцных дажджоў

## У выхадныя днём чакаецца ўсяго ад плюс 13 да 21 цяпла

**Атмасферны фронт, які змяшчаецца з Заходняй Еўропы, прынясе ў нашу краіну навальнічныя дажджы і выцесніць цёплае паветра за яе межы. Услед за ім на тэрыторыю Беларусі пачнуць паступаць паветраныя масы з паўночнага захаду Еўропы, і ў гэтыя выхадныя тэмпературны фон істотна панізіцца, перадае Белгідрамет.**

У ноч на суботу пад уплывам атмасферных франтоў па паўднёвым усходзе краіны, а днём на большай частцы тэрыторыі чакаюцца дажджы. Раніцай і ўдзень у некаторых паўднёва-ўсходніх раёнах дажджы моцныя. Месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—12 цяпла, па паўднёвым усходзе краіны — плюс 13—14 градусаў. Удзень будзе не вышэй за 13—19 цяпла, толькі па паўднёвым захадзе крыху цяплей — да плюс 21 градуса. Захаваецца халаднаватае няўстойлівае надвор'е і ў нядзелю. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у некаторых раёнах на паўночным усходзе чакаюцца моцныя ліўні. Днём месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 да плюс 11 градусаў, удзень — 14—21 цяпла.



Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак уначы ў некаторых раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 да плюс 12 градусаў. Удзень будзе ў асноўным ад 14 да 21 цяпла, па поўдні краіны месцамі паветра прагрэецца да плюс 23 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Ападкі і яшчэ раз ападкі!

## Мінлясгас аб увядзенні і зняцці забарон на наведванне лясоў

**У сувязі з павелічэннем колькасці зваротаў па пытанні ўвядзення і зняцця забарон на наведванне лясоў Міністэрства лясной гаспадаркі палічыла неабходным выступіць з тлумачэннямі.**

Рашэнне аб увядзенні або зняцці забароны на наведванне лясоў, згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, прымаюць мясцовыя распарадчыя і выканаўчыя органы. Адпаведна, інфармацыю аб наяўнасці або адсутнасці дазволеных участкаў для праходу да дачных участкаў, збору грыбоў і г. д. могуць даць у раённых выканаўчых камітэтах або ў лягасах на месцах. Пры гэтым супрацоўнікі лягасаў і аддзелаў па надзвычайных сітуацыях могуць звярнуцца ў распарадчыя і выканаўчыя органы з хадайніцтвам аб увядзенні або зняцці забароны.

Галоўная мэта ўвядзення забарон на наведванне лясоў — гарантаванне бяспекі грамадзян, захаванасці іх маёмасці і ляснога фонду. Як правіла, дадзеная мера ўводзіцца пры высокай ці надзвычайнай пажарнай небяспецы па ўмовах надвор'я, калі пажар можа пачацца ад найменшай іскры. Сусветны вопыт паказвае, што ахвярамі лясных пажараў нярэдка становяцца людзі. Напрыклад, у мінулым годзе ў Партугаліі пры лясным пажары загінула больш за 50 чалавек — не змаглі выбрацца з палаючага лесу.

Для таго каб знізіўся клас пажарнай небяспекі, неабходна працяглае (на працягу некалькіх дзён) і інтэнсіўнае выпадзенне ападкаў. Толькі ў такім выпадку пажаранебяспечная абстаноўка ў лясным фондзе можа стабілізавацца. Трэба разумець, што дакладных тэрмінаў дзеяння забароны на наведванне лясоў няма. Такім чынам, пытанне «Калі здымуць забарону на наведванне лясоў у пэўным раёне?» можа мець толькі адзін адказ: «Пасля выпадзення ападкаў у лясным фондзе».

За апошнія дні забароны на наведванне лясоў былі зняты ў некаторых раёнах Гомельскай і Гродзенскай абласцей. Аднак на дадзены момант абмежавальныя меры дзейнічаюць у 83 раёнах краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Класныя навіны

# У школу вяртаецца прафесійная падрыхтоўка

**У 10-х класах школ з'явяцца шэсць гадзін «Працоўнага навучання» на тыдні. Колькасць урокаў замежнай мовы ў гімназіях не зменшыцца. А на ўсіх ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ўстанаўліваецца аднолькавая колькасць гадзін на вывучэнне беларускай і рускай моў.**

Міністэрства адукацыі зацвердзіла тыпавыя навучальныя планы на 2018/2019 навучальны год для ўсіх відаў установ агульнай сярэдняй адукацыі, з якімі можна азнаёміцца на партале ведамства ў раздзеле «Агульная сярэдняя адукацыя»/«Да пачатку 2018/2019 навучальнага года». У каментарыі да пастановы міністэрства адзначаецца, што цяпер магчымасць вывучаць асобныя вучэбныя прадметы на павышаным узроўні будзе як у сярэдніх школах, так і ў гімназіях.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі могуць ствараецца класы (групы) з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

У V—VII класах гімназій захавана колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне замежнай мовы (пяць гадзін у тыдзень). У такім жа аб'ёме вывучаць замежную мову можна ў V—VII класах базавых і сярэдніх школ. У 8-м класе і гімназіі, і школы таксама могуць праводзіць пяць урокаў замежнай мовы. Акрамя таго, у 8-м класе навучэнцы і гімназій, і школ могуць вывучаць на павышаным узроўні і любы іншы прадмет або некалькі вучэбных прадметаў.

Яшчэ адной адметнай асаблівасцю тыпавога вучэбнага плана на наступны навучальны год з'яўляецца ўвядзенне ў 10-м класе школ прадмета «Працоўнае навучанне». Раней вывучэнне гэтай дысцыпліны завяршалася ў 9-м класе. З 1 верасня ў рамках дадзенага вучэбнага прадмета дзесяцікласнікі будуць атрымліваць прафесійныя навыкі, асвойваючы адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) у аб'ёме шасці гадзін у тыдзень. У гімназіях і профільных класах сярэдняй школы ў дзесяцікласнікаў «Працоўнага навучання» не будзе.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

### ЗБОРНАЯ ФРАНЦЫІ ТРЭЦЯЙ ТРАПІЛА Ў ПЛЭЙ-ОФ

У групе С учора першы матч дня Данія — Аўстралія завяршыўся нічыёй — 1:1. Скандынавы актыўна папрэсінгавалі саперніка адразу ў пачатку матча, і на сёмай хвіліне Крысціян Эрыксен забіў прыгожы гол. Далей датчане пачалі дзейнічаць па прыкладзе Уругвая ў яго матчы супраць Саудаўскай Аравіі, але з тым адрозненнем, што не змаглі пакінуць свае вароты сухімі. У сваёй штрафной мяч трапіў Поўльсену ў руку, і аўстралiец Міле Едзінак таксама з пенальці забіў свой другі мяч на чэмпіянаце. І зноў 11-метровы быў прызначаны пасля выкарыстання VAR — сістэмы відэадапамогі арбітрам. Што цікава, дацкі нападаючы Поўльсен зарабіў ужо другі пенальці, першы здарыўся ў матчы з Перу, але тады яго камандзе пашанцавала — сапернік прамазаў. Далей на полі лепш гулялі варатары, чым нападаючыя, і галоў у матчы больш забіта не было.


rsport.ria.ru

У другім матчы групы С амбіцыйная зборная Францыі абыграла сімпатычную зборную Перу з любімым у апошні час многімі камандамі лікам 1:0, гол забіў Кілян Мбапэ. Зноў можна ўспомніць з непрыемным адценнем Уругвай, які паказаў дрэнны прыклад утрымання мінімальнага пераможнага выніку, які пайшоў «у народ», такую ж гульню пасля забітага гола паказалі і трохкаляровыя. Зрэшты, калі стаўкай з'яўляецца працяг барацьбы на чэмпіянаце свету, мала хто паступіў бы інакш. Такім чынам, французы накіроўваюцца ў 1/8 фіналу, а Перу пасля яшчэ адной гульні — дадому.

### З-ЗА ЧЭМПІЯНАТУ НАРАДЖАЮЦЦА ДЗЕЦІ

La Gazzetta dello Sport размясціла ў сябе на сайце матэрыял, які падымае вельмі важную праблему: «Чэмпіянат свету, запасы піва вычэрпваюцца». «Здаецца, балельшчыкі п'юць толькі піва», — рэзюмэ рые выданне, пагутарыўшы з разгубленымі афіцыянтамі Масквы.

Тэлеканал «Чэ» змяніў назву на найбліжэйшы час у гонар галоўнага трэнера зборнай Расіі Станіслава Чарчэсава. Аватарка канала ва ўсіх сацыяльных сетках цяпер называецца «Станіслаў Чэ», а ў эфіры на лагатыпе з'явіліся вусы коўча.

Жанчына раней часу нарадзіла падчас матча паміж зборнымі Расіі і Саудаўскай Аравіі і вырашыла назваць сына ў гонар гульца зборнай Расіі Аляксандра Галавіна, паведаміў міністр аховы здароўя Краснадарскага краю Яўген Філіпаў. «У Краснадарскім краі адна пацыентка, якая была цяжарная 36 тыдняў, так перажывала падчас матча, што ў яе пачаліся роды, і нарадзіла ў той момант, калі завяршыўся матч. Таму сына назвалі Аляксандрам», — цытуе Філіпава «Інтэрфакс».

**Іван КУПАРВАС.**

# ПАГРОЗ ДЛЯ РУБЛЯ НЕ ВІДАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Інфляцыя сёлета значна ніжэйшая за ўстаноўленую Нацбанкам на канец года верхнюю планку ў 6 %, але верагодны яе рост у другім паўгоддзі ўскладняе зніжэнне стаўкі рэфінансавання.

Рэгулятар улічвае суб'ектыўныя ацэнкі насельніцтвам росту цэн і чаканы ўзровень інфляцыі. Паводле майскіх апытанняў Нацбанка, адчувальны ўзровень інфляцыі склаў 12,9 %, а чаканы на год наперад — 11,4 %, гэта значыць больш чым у два разы вышэй за фактычную інфляцыю.

Перашкаджаюць зніжэнню стаўкі і глабальныя тэндэнцыі. Чаканне працягу росту стаўкі ФРС (Федэральнай рэзервовай сістэмы) ЗША прывяло да глабальнага адтоку капіталу з рынкаў, якія развіваюцца на карысць долара. Змагаючыся з гэтым адтокам, за апошнія месяцы свае ключавыя стаўкі паднялі Малайзія, Чэхія, Мексіка, Саудаўская Аравія, Кувейт, Аргенціна, Румынія, Філіпіны, Турцыя, Пакістан, Інданезія і Індыя. Ледзь не адзінай краінай, якая знізіла ў нядаўні час стаўку, застаецца Казахстан. Дарэчы, Цэнтральны банк Расіі ў мінулую пятніцу адмовіўся ад зніжэння стаўкі.

### Рост крэдытавання насельніцтва бяспечны для эканомікі

Дырэктар «Альпары Еўразія» адзначыў, што сітуацыя з крэдытамі для фізічных асоб на фоне развіцця эканомікі і дзеянняў фінансавага рэгулятара на бягучым этапе не ўяўляе небяспекі.

Запазычанасць насельніцтва банкам толькі пачала расці пасля спаду ў 2015—2016 гадах, калі краіна знаходзілася ў рэцэсіі. Акрамя гэтага, у апошнія гады манетарныя ўлады праводзяць дастаткова ўзважаную, асцярожную грашова-крэдытную палітыку, што не дазволіць сітуацыі выйсці з-пад кантролю. Рост крэдытнага партфеля фізічных асоб адбываецца на фоне макраэканамічнай стабілізацыі, запавольвання інфляцыі, росту ВУП.

Увогуле няма рызыкі рэзкай дэвальвацыі, росту цэн або агульнаэканамічнага крызісу, які мог бы прывесці да рэзкага падзення заробкаў і занятасці і ўскладняў бы для пазычальнікаў вяртанне крэдытаў. Дапамагае трымаць пад кантролем сітуацыю з крэдытамі і ўведзенае Нацбанкам патрабаванне суаднясіць выплаты па крэдытах з агульным даходам яго атрымальніка.

### Якім будзе курс рубля?

Кажучы пра сітуацыю на валютным рынку, Аляксандр Сабодзін адзначыў, што назіраецца ўстойлівая стабілізацыя. З пачатку года долар вырас да беларускага рубля менш як на 2 %, еўра знізіўся больш чым на 1 %, а расійскі рубель страціў да беларускага каля 7,5 %. Валютны кошык знізіўся ад пачатку года прыблізна на 3,5 % і вярнуўся да ўзроўню жніўня мінулага года.

Асنова ўмацавання беларускага рубля — станоўчае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі, а таксама перавышэнне продажу валюты над куплям, перш за ўсё за кошт валютных зберажэнняў насельніцтва.

Пакуль што кіраўніцтва Нацбанка праводзіць узважаную і асцярожную грашова-крэдытную палітыку, не выкарыстоўваецца друкарскі станок, абмежавана дырэктыўнае крэдытаванне, штучна не разганяецца зарплата — і ўстойлівасці рубля нішто не пагражае. Рубель, хутчэй за ўсё, будзе ў доўгатэрміновым перыядзе зніжацца, але без скачкоў, плаўна, прыблізна прапарцыянальна інфляцыі, якая сама па сабе ў апошнія гады запавольваецца. Пытанне аб тым, як доўга можа працягнуцца такая сітуацыя, адлюстроўвае ўласцівы многім страх, што стабільнасць гэтая можа скончыцца.

З боку цяперашняй грашова-крэдытнай палітыкі пагроз для рубля не відаць. З іншага боку, застаецца рызыка знешніх шокаў. Напрыклад, рэзкага зніжэння сусветных цэн на асноўныя пазіцыі беларускага экспарту, такія як нафтапрадукты або калійныя ўгнаенні. Або, як прыклад магчымай пагрозы, рэзкае паслабленне расійскай валюты можа пацягнуць за сабой і беларускі рубель.

### Што нам змяненне цэн на нафту?

Аляксандр Сабодзін падчас анлайн-канферэнцыі нагадаў, што ў маі нафта маркі Brent некалькі разоў распачынала штурм адзнакі ў 80 долараў за барэль. Услед за цаной нафты расце і цана нафтапрадуктаў.

**Увогуле няма рызыкі рэзкай дэвальвацыі, росту цэн або агульнаэканамічнага крызісу, які мог бы прывесці да рэзкага падзення заробкаў і занятасці і ўскладняў бы для пазычальнікаў вяртанне крэдытаў.**

Дык вось. Падаражанне нафты вельмі спрыяльна адбіваецца на нашым экспарце і прытоку валюты ў краіну. Пры гэтым ускосным эфектам ад росту нафтавых цэн можа стаць і рост попыту ў Расіі на беларускую прадукцыю. Але станоўчы эфект не будзе доўжыцца вечна. З майскіх максімумаў цэны ўжо знізіліся да 72—74 долараў за барэль.

У Вене сёння на саміце АПЕК будзе абмяркоўвацца пытанне паступовага выхаду з пагаднення аб скарачэнні здабычы нафты. Саудаўская Аравія і Расія разглядаюць варыянт нарошчвання здабычы на 1 млн барэляў у дзень (пасля папярэдняга скарачэння на 1,8 млн барэляў у дзень). Гэта можа выклікаць хуткае зніжэнне цэн да 70—71 долара і ніжэй.

У больш доўгатэрміновай перспектыве негатыўны ўплыў можа аказваць расійскі падатковы манеўр. З аднаго боку, гэта рост уваходных цэн на сырую расійскую нафту, з другога — скарачэнне экспартных пошлін, якія застаюцца ў бюджэце краіны. Таму ўсё больш актуальнай становіцца дыверсіфікацыя беларускага экспарту і памяншэнне залежнасці эканомікі Беларусі ад кан'юнктуры сусветнага рынку нафты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЗРАБІЛІ СТАЎКУ РЭКОРДНА НІЗКАЙ — 10 %

## Гэта мінімальны ўзровень стаўкі, апошні раз ён дзейнічаў у пачатку 2008 года

**Як мы ўжо паведамлялі, з 27 чэрвеня стаўка рэфінансавання зніжаецца з 10,5 да 10 працэнтаў гадавых, стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці — з 11,75 да 11,5 працэнта гадавых. Дакумент аб гэтым падпісаны 20 чэрвеня праўленнем Нацыянальнага банка на штоквартальным пасяджэнні па грашова-крэдытнай палітыцы.**




У прэс-службе рэгулятара адзначылі, што гадавая інфляцыя запавольваецца, а прагноз развіцця сітуацыі ў эканоміцы, у знешнім гандлі, на валютным і дэпазітным рынках паказвае, што грашова-крэдытныя ўмовы, якія фарміруюцца, забяспечваць знаходжанне інфляцыі ў рамках мэтавых параметраў.

У маі прырост спажывецкіх цэн у гадавым вымярэнні склаў 4,4 працэнта пры 5 працэнтах у красавіку. Гадавая базавая інфляцыя запаволілася да 2,9 працэнта (3,1 працэнта ў красавіку), у тым ліку з прычыны ўмацавання беларускага рубля адносна кошыка замежных валют. У іншай палове года чакаецца некаторы рост інфляцыі з улікам больш слабага дэзінфляцыйнага ўплыву ўнутранай эканомікі, а таксама магчымага павелічэння рэгуляваных цэн. Фарміраванне курса беларускага рубля паблізу раўнаважкага ўзроўню не будзе аказваць ціску на цэны. Манетарныя ўмовы захаваюцца блізкімі да нейтральных і працягнуць забяспечваць дасягненне мэты па цэнавай стабільнасці. Чакаецца, што па выніках 2018 года інфляцыя будзе каля 5,5 працэнта.

Уздзеянне ўнутранага попыту на дынаміку цэн у сярэднетэрміновай перспектыве ацэньваецца як умеранае. Стрымліванню інфляцыі ў сярэднетэрміновай перспектыве будзе спрыяць паступовае зніжэнне інфляцыйных чаканняў, што адбываецца пад уплывам бягучай умеранай дынамікі спажывецкіх цэн і арыентацыі грашова-крэдытнай палітыкі на падтрыманне цэнавай стабільнасці.

■ Дзеля экалогіі

# ЗДАЙ СТАРЫ КАМП'ЮТАР — АТРЫМАЙ ГРОШЫКІ

**Холдынгам «Белрэсурсы» распачаты збор адходаў электрычнага і электроннага абсталявання ад насельніцтва.**

Масавы збор адходаў бытавой тэхнікі ўпершыню арганізаваны з 4 чэрвеня гэтага года ў 32 пунктах арганізацый, якія ўваходзяць у холдынг, размешчаных у Мінску і Мінскай вобласці, а таксама Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцях. Збор ажыццяўляецца ў неразабраным выглядзе. Узнагароджанне насельніцтву за здадзеныя адходы электрычнага і электроннага абсталявання — 25 капеек за 1 кілаграм.

Збор адходаў бытавой тэхнікі ў камплектным (неразабраным) выглядзе з далейшай перадачай арганізацыям, якія вядуць іх перапрацоўку, дазволіць пазбегнуць пагрозы забруджвання навакольнага асяроддзя азонаразбуральнымі рэчывамі і іншымі кампанентамі.

Электроннае абсталяванне і аргтэхніка адрозніваюцца ад іншых відаў адходаў складанай кампанентнай структурай, наяўнасцю ў складзе досыць высокіх канцэнтрацый таксічных кампанентаў (свінцу, ртуці, мыш'яку, берылію) і каштоўных металаў (золата, серабра, плаціны, паладыю).

Любы камп'ютар або тэлефон можна перапрацаваць і пусціць у другаснае выкарыстанне. Пры правільнай утылізацыі каля 95 % адходаў тэхнікі здольныя вярнуцца да спажыўца ў тым ці іншым выглядзе і толькі каля 5 % адпраўляюцца ва ўтыль. У мінулым годзе ў нашай краіне сабрана і накіравана на перапрацоўку 18,3 % ад агульнага аб'ёму ўтварэння электрычнага і электроннага абсталявання, якое, па разліковых даных, у краіне склала не менш за 30 тысяч тон.

Адрасы ўсіх 32 прыёманарыхтоўчых пунктаў вы знойдзеце на сайце нашага выдання zviazda.by.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Наўздагон

# РЫБА ПАЦЯРПЕЛА АД АДХОДАЎ ЗАВОДА

**Адходы ААТ «Гальшанскі крухмальны завод» сталі прычынай мору рыбы на рацэ Гальшанцы (Альшанцы) у Гродзенскай вобласці, паведамілі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Нагадаем, масавы мор рыбы адбыўся тут у пачатку месяца. Работнікі Смаргонскай міжраённай інспекцыі сабралі 176 загінулых асобін на ўчастку ракі паміж вёскамі Нарушаўцы і Дзертнікі. Аператыўныя групы, створаныя ў Гродзенскім і Мінскім абласных камітэтах прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, лабараторыі Рэспубліканскага цэнтра аналітычнага кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя пры Мінпрыроды (Смаргонская і Маладзечанская міжраённыя лабараторыі аналітычнага кантролю), зрабілі адбор проб паверхневых і сцёкавых вод на пяці ўчастках ракі Гальшанка (Альшанка) на тэрыторыі Ашмянскага і Валожынскага раёнаў. Былі адабраны пробы сцёкавых вод аварыйнага скіду з карт-накапляльнікаў ААТ «Гальшанскі крухмальны завод».

Праведзеныя даследаванні ў месцы аварыйнага скіду з карт-накапляльнікаў прадпрыемства зафіксавалі перавышэнне паказчыкаў біяхімічнага спажывання кіслароду — 161 ГДК (гранічна дапушчальнай канцэнтрацыі), хімічнага спажывання кіслароду — 36 ГДК, па амоній-іоне — 24 ГДК, па фасфат-іоне — 21 ГДК, па ўзважаных рэчывах — 6 ГДК. Прычынай перавышэння гэтых паказчыкаў з'яўляецца паступленне ў ваду вялікай колькасці арганічных і біягенных рэчываў. У рацэ вышэй месца аварыйнага скіду гэтыя паказчыкі знаходзяцца ў межах нормы. Гродзенскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя пачаў адміністрацыйны працэс у дачыненні да вінаватай асобы. Паводле папярэдніх разлікаў, шкода, нанесеная навакольнаму асяроддзю, склала 2,5 тысячы рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# Сяржант загінуў на «вогненным» пасту

**Пры тушэнні ляснога пажару ў Жлобінскім раёне загінуў ратавальнік.**

Па інфармацыі Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, пажарны Жлобінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, сяржант унутранай службы, падчас работ на месцы лясного пажару паблізу вёскі Лясань страціў прытомнасць. Рэанімацыйныя мерапрыемствы праводзілі спачатку самі ратавальнікі, а затым прыбыўшая брыгада хуткай медыцынскай дапамогі. Аднак увечары медыкі мусілі канстатаваць смерць...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




# НЕ НЫЦЦЁМ ДЫК... БУНТАМ

Цяпер у вёсках мала хто трымае кароў. І пасвіць іх, і нарыхтоўваць сена, і даіць-даглядаць людзям сталага веку цяжка, моладзі — не ахвота. А вось некалі рагуля (а то і не адна) была на кожным падворку, бо як жа без малака? У крайнім выпадку — казінага. Памятаю, у нашай вёсцы была гаспадыня, якой, мусіць, вельмі балела спіна і якая для таго, каб падаіць сваю козачку, для большай зручнасці ставіла яе на стол, як ручную швейную машынку...

У нас жа была карова. Мне нават давялося за цэлым статкам пахадзіць, хоць і ў якасці падпаска. Даіць жа карову, як і ўсе нашы хлопцы, я не вучыўся з прынцыпу, бо не мужчынская гэта справа. А вось малако любіў, асабліва ў дзяцінстве.

Аднойчы (мне было гадоў з пяць) ускараскаўся я на стол, як тая каза, і ўжо адтуль пазіраў на вялікі вэрхал, які называўся «рамонт у хаце». Рабілі яго мае бацькі, а я трымаў у руках сваю любімую цацку — флакон з-пад адэкалону, напоўнены вадой, і праз яе разглядаў газету (можа, нават «Звязду»). Праўда, не моўчкі, бо з раніцы (а ўжо пад абед) быў галодны і прасіў, ды што там — нават патрабаваў есці. Аднак бацькі, захапіўшыся справай, не звярталі ўвагі ні на мяне, ні на маё ныццё, што выглядала прыкладна так:

— Мы будзем абедаць? — канькаў я.

— Хацелася б ведаць! — адгукалася маці.

— Мне трэба пад'есці!

— Адкуль тыя весці? — гэта ўжо тата.

— Дайце хоць малака! — ішоў на кампраміс я.

— Падаі быка, — раіла мама.

Вось гэтага, апошняга, я ўжо не сцярпеў: пакрыўдзіўся, адвёў руку са сваёй любімай цацкай і з усёй сілы шпурнуў яе ў дзверы.

Флакон са звонам разбіўся, шкло, як здалося, разляцелася па ўсёй хаце...

Я не на жарт спалохаўся і з жахам чакаў рэакцыі бацькоў.

На шчасце, яны хіба рассмяяліся ды, магчыма, успомнілі крылатае: галоднаму хлеба, халоднаму цяпла, а сытаму — музыкі.

Я, ва ўсякім разе, атрымаў не толькі малака, але і нешта «зверху» — не ныццём дык бунтам.

**Яўген Шастакоў,**
*г. Гомель.*

# ВЕДАЙ, КАТОК, СВОЙ КУТОК

Сённяшнія дзеткі, што называецца, прападаюць — суднямі сядзяць пры сваіх камп'ютарах, планшэтах, углядаюцца ў экраны мабільнікаў.

У час майго дзяцінства такіх цудаў тэхнікі, вядома ж, не было — хіба праўдзівае радыё ды адзін-два тэлевізары на ўсю вёску (у чужой хаце, згадзіцеся, не дужа нешта паглядзіш). Вось і гойсалі мы па вуліцы, вось і займаліся чым хацелі і як хацелі.

Помню, неяк летам апынуліся каля фермы. Кароў там не было — выгналі на пашу. А сам кароўнік, расчыніўшы дзверы, нібы адпачываў — «дыхаў» свежым паветрам, вабіў зайсці.

Мы, узброеныя саматужнымі рагаткамі, пісталетамі, вінтоўкамі ды лукамі, вядома ж, зазірнулі і, агледзеўшыся, распачалі «вайну». Прычым мне ў ёй яўна не пашчасціла: з нейкай «зброі» і незнарок я выбіў шыбу — невялічкую, не столькі тога шкла, колькі звону... І потым страху.

І з плачам паімчаў дахаты:

— Тоня, мяне пасадзяць у турму! — з адчаем аб'явіў любімай бабулі.

— Гэта ж за якое злачынства, дзіцятка? — здзівілася яна.

І потым, выслухаўшы, караць не стала: суцешыла, папрасіла суседа зашкліць тое акенца. А нарэшце строга прыказала, каб на ферму больш — ні нагой, ніколі.

Я паабяцаў і доўга трымаўся — не хадзіў, хоць і хацелася. Але ж неяк, ужо ў школьныя гады, чэрці занеслі: замучыла нас з хлопцамі смага, нехта сказаў, што вады там — хоць заліся, і мы пайшлі.

У кароўніку высока пад столлю была вялікая ёмістасць. Вада ў яе набіралася з блізкай рэчкі і ўжо адтуль паступала да паілак і кранаў.

Адзін з іх мы адкрылі і напіліся (рачной).

Але гэтага здалося мала: у кароўніку былі падвясныя ваганеткі, на якіх з памяшкання вывозіўся гной. Яны гучна перамяшчаліся ўздоўж прахода, і на іх, моцна ўхапіўшыся ды падціснуўшы ногі (а да таго адшукаўшы чысцейшае месца), можна было метраў колькі праехаць — на сваю рызыку...

Не ведаю, колькі б мы каталіся, калі б за гэтым занятакам нас не заспеў адзін, мякка кажучы, п'янаваты дзядзька, не закрычаў, што мы — асталопы: знайшлі дзе гуляць. Тут, маўляў, хіба скалечыцца ці пава...

Слова гэтае дзядзька не дагаварыў: ён... аступіўся і ледзь не па калені ўваліўся ў рудую жыжу.

Не ведаю, як бы ён з яе выбіраўся...

Мы, як маглі, памаглі, потым падвялі да крана — абмылі штаны, абутак.

Дзядзька з той удзячнасці выдаў нам па дваццаць капеек: для малых і па тым часе — грошы, але ж... не кампенсацыя.

Ва ўсякім разе, пасля гэтага здарэння мы на ферму больш не хадзілі.

**Аляксандр Матошка,**
*г. п. Расоны.*

# ІНШЫ БОК МЕДАЛЯ

...З чаго пачалося: ідзе неяк па вуліцы мая суседка і — рот да вушэй — сама сабе ўсміхаецца. Пытаюся:

— Нешта смешнае з'ела?

— Вой, не кажыце! — усклікае тая. — На юбілеі была — каляжанка запрасіла. І накарміла, і напаіла, а ўжо з кім за стол пасадзіла, вы не паверыце: з самім Кабзонам!

— ?!

— Значыць, прыходжу, — здалёк пачынае жанчына, — юбілярка з гасцямі знаёміць, са сваёй стрыечнай сястрой. Жанчына — скажу вам — якіх пашукаць: прывабная ва ўсіх адносінах. А ўжо прыбраная... І сукенка на ёй, і туфлі, і прычоска валасок да валаска, і завушніц, пярсцёнкаў, ланцужкоў, як на ёлцы: дзе толькі месца вольнае, там і ёсць...

Я ўсё разгледзела, бо насупраць сядзела. А яна ж адразу рэй павяла. Відаць, прывыкла выступаць ды камандаваць, быць навідавоку. Ну і пачала: верш-прысвячэнне — ад яе, тост — яе, анекдот ды песня — таксама...

Голас у запевалы і праўда, прыгожы — не падкапаешся. Вось яна і зацягвае, а ўжо мы — то ўсе падпяваем, то маўчым, калі знак падасць, бо яна тады сола вядзе.

Карацей, цэнтр увагі, галоўная госця — на юбілярку ніхто не зважае: усе гэту артыстку слухаюць.

Муж яе, бачу, да такога прывык, жонцы не пярэчыць (відаць, звычкі не мае), але ж час ад часу далікатненька просіць: маўляў, Кабзон ты мой, можа, досыць? Можа, памаўчыш, адпачнеш крыху?

Жонка, што называецца, і не думае: гне сваё — што нікога не здзіўляе. Але ж пры чым тут Кабзон? Ён, як бачыцца, ніколі не спяваў ні пра ваду, што ў ярок цячэ, ні пра сівага каня, ні пра чарку на пасашок?

Дарэчы, нават пасля яе салістка не перастала выступаць: новыя песні стала заводзіць — ужо ўласнай, мусіць, «вытворчасці», бо ніхто з гасцей іх не чуў, слоў не ведаў. Ды і песні, мякка кажучы, былі так сабе — слухаць не хацелася.

Госці сталі перамаўляцца, шумець, але аўтарка ні на што не зважала, яна — з апошніх сіл, можна сказаць, — спявала, несла песню ў народ, аж да сёмага поту.

Ён спачатку выступіў на лбе ды на пераноссі (жанчына выцерла), потым «зацурчэў» па скронях (яна ўсё мацала: адкуль?), па шыі пацёк — у «лагчынку», што ў дэкальтэ: ведама, гарачыня — і ў хаце градусаў 30, і ўнутры за 40 (жанчына піла гарэлку).

Карацей, яна зусім змаглася і...

Сцягнула з галавы парык, сказала «Як жа ты мне збрыдзеў!» і пляснула ім аб стол.

Цішыня вакол наступіла — проста мёртвая: ніхто ні слоўка, ні паўслоўка...

— Во з якім Кабзонам я за сталом сядзела, — завяршыла раскад суседка.

А потым яшчэ дадала, што яно і зразумела: спевакам-аматарам да сапраўдных артыстаў — як ад зямлі да сонца. Тыя, вядома ж, умеюць трымацца, прычым да канца...

А зрэшты, хто яго ведае? Можа, яны таксама калі «зрываюцца», і мы проста не бачым?

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР**

Аукцион начинается с объявления аукционистом порядка проведения аукциона, места нахождения и краткой характеристики единого предмета аукциона, шага аукциона, который устанавливается организатором аукциона в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены единого предмета аукциона. После сообщения данной информации аукционист объявляет начальную цену единого предмета аукциона. Первая объявляемая аукционистом цена единого предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона от начальной цены единого предмета аукциона. После объявления первой цены аукционист называет аукционный номер участника аукциона, который первым поднял номер, и указывает на него, а если по объявлении первой цены аукционные номера подняли не менее двух участников – в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет его победителем аукциона. Если после объявления аукционистом первой цены аукционный номер поднял только один участник аукциона, то аукционист называет номер такого участника аукциона трижды и объявляет его победителем аукциона.

Если два и более участника аукциона согласились с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласился со следующей объявленной им ценой, аукционист предлагает участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона. После объявления участником аукциона своей цены аукционист называет аукционный номер этого участника и предложенную им цену. При этом предложенная участником аукциона цена, равная цене, предложенной другим участником аукциона, не принимается. Участники аукциона объявляют свою цену до тех пор, пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже единого предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему единому предмету аукциона. Если после предложения аукциониста участникам аукциона объявить свою цену только один из участников объявит свою цену, аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды предложенную им цену и при отсутствии предложений иных участников аукциона объявляет о продаже единого предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона. Если ни один из участников аукциона не предложил своей цены, аукцион в отношении единого предмета аукциона признается нерезультативным.

По завершении аукциона аукционист объявляет о продаже данного единого предмета аукциона, трижды называя цену, по которой продан единый предмет аукциона, и номер участника аукциона, ставшего победителем аукциона.

Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, единый предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 27.12.2007 № 667 победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения соответствующим исполнительным комитетом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона; после совершения победителем аукциона (единственным участником несостоявшегося аукциона) названных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Оплата стоимости приобретенного имущества производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи.

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Душ. Аналіз. Ствол. Ікаўка. Рынак. Накат. Лама. Шар. Пот. Ака. Язда. Сон. Ала. Дрыль. Аер. **Па вертыкалі:** Дыван. Шалік. Улоў. Язва. Ксеракопія. Апал. Крама. Каштан. Тартак. Апіска. Зебра. Апала. Лье.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.46 | 17.09 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.44 | 17.26 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.36 | 17.09 |
| Гомель — | 4.34 | 21.23 | 16.49 |
| Гродна — | 4.54 | 21.59 | 17.05 |
| Брэст — | 5.05 | 21.50 | 16.45 |

## Месяц

*Першая квадра 20 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

## Імяніны

*Пр.* *Марфы, Марыі, Фёклы, Аляксандра, Аляксея, Кірылы.*
*К.* *Паўліны, Інакенція, Тамаша, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 22 ЧЭРВЕНЯ

**У краіне**

**1593** год — мінскім ваяводам быў прызначаны Ян Абрамовіч — прадстаўнік шляхецкага роду, адзін з галоўных дзеячаў-кальвіністаў у Вялікім Княстве Літоўскім, прыхільнік іх саюза з праваслаўнымі ў барацьбе з каталіцызмам і незалежных пазіцый ВКЛ у адносінах з Польшчай, які змяніў на гэтай пасадзе Багдана Сапегу. Прабыў на пасадзе да 1596 года.

**1888** год — нарадзіўся Іосіф Шнаркевіч (вёска Саска Ліпка Нясвіжскага раёна), беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, педагог. Удзельнік з'езда настаўнікаў Мінскай губерні ў 1917 годзе. Працаваў выкладчыкам у Нясвіжскай прыватнай жаночай гімназіі, якую рэфармаваў у Нясвіжскую беларускую гімназію. У 1925—1926 і ў 1928—1933 гадах выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі. У 1927 і 1939 гадах быў арыштаваны польскімі ўладамі, інтэрніраваны ў канцлагер у Картуз-Бярозе, вызвалены з прыходам савецкіх войскаў.

**1903** год — нарадзіўся Вікенцій Скрыганаў (вёска Надзейкавічы Рагачоўскага раёна), военачальнік, генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза. Удзельнік Грамадзянскай вайны на Заходнім і Паўднёвым франтах. У 1922—1935 гадах у войсках Беларускай ваеннай акругі: камандзір батарэі, памочнік начальніка штаба брыгады і начальнік артылерыі палка. У час Вялікай Айчыннай вайны на Заходнім, Паўднёвым, Закаўказскім, Паўночна-Каўказскім, Паўднёва-Заходнім, 3-м, 2-м, 1-м Украінскіх франтах. Асабліва вызначыўся ў студзені 1945-га. Дывізія пад яго камандаваннем прарвала ўмацаваную абарону праціўніка на захад ад горада Сандамір (Польшча), нанесла яму вялікія страты, за 11 дзён прайшла з баямі 264 км, фарсіравала Одэр.

**1913** год — нарадзіўся Аляксандр Авечкін, беларускі пісьменнік. Аўтар аповесцяў «Саломка», «Каля Дзіўных гор», апавяданняў «Асаблівае заданне», «Давер». Памёр у 1980 годзе.

**1938** год — нарадзілася беларуская спартсменка і трэнер (парашутны спорт) Вера Зубава. Майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі. Чэмпіёнка свету па паветранай акрабатыцы, сярэбраны прызёр у мнагабор'і і асабістым першынстве. Рэкардсменка свету.

**1941** год — пачалася Вялікая Айчынная вайна, якая працягвалася 1418 дзён. Адны мі з першых прынялі на сябе ўдар абаронцы Брэсцкай крэпасці.



**У свеце**

**1889** год — Германія першая ў Еўропе ўвяла пенсіі па старасці.

**1898** год — нарадзіўся Эрых Марыя Рэмарк, нямецкі пісьменнік. Аўтар раманаў, сярод якіх — «На Заходнім фронце без перамен», «Тры таварышы», «Трыумфальная арка».

**1933** год — нарадзілася расійская актрыса тэатра і кіно, народная артыстка РСФСР Людміла Іванова. Здымалася ў фільмах «Настаўнік спеваў», «Службовы раман», «Чалавек з акардэонам».

**1978** год — адкрыты спадарожнік Плутона — Харон.

**1983** год — у НХЛ уведзены авертайм (дадатковыя пяць хвілін гульні да першага гола ў выпадку нічыёй у асноўны час).

## УСМІХНЕМСЯ

**Чарга ў пляжны туалет — гэта месца, дзе збіраюцца прыстойныя людзі.**

— Алё, ваша таксі пад'ехала.

— Але я яго не заказваў!

— Часы цяжкія, цяпер мы самі кліентаў шукаем.

**Ёсць два віды зайздросных жанчын. Першыя хочуць такога ж мужчыну, як у цябе, а другія хочуць, каб у цябе яго наогул не было.**

У кнігарні:

— Парайце які-небудзь круты дэтэктыў.

— Вось, калі ласка!

Пакупнік чытае назву: «Забойца — цырульнік».

— Дазвольце, але ж уся інтрыга забіваецца назвай!

— А вы прачытайце анатацыю.

Пакупнік чытае:

— Штогадовы чэмпіянат свету па цырульніцкай справе сабраў паўтары тысячы ўдзельнікаў...



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2252.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 чэрвеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

22 чэрвеня 2018 г. № 25 (458)



стар. 13

**Горад, дзе паселіцца атам**



стар. 15

**Ці бачная вёска... за кустамі?**



стар. 16

**Запрашае народны тэатр!**

ТЭМА НУМАРА

# ШТО МОГУЦЬ РЭГІЁНЫ?



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Савет Рэспублікі працягвае выязныя пасяджэнні ў абласцях. Парламентарыі наведалі Гродзеншчыну**

стар. 2–3

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# І ЗАХАВАЦЬ, І ЗАРАБІЦЬ

## Менавіта ў такім парадку мы павінны выбудоўваць нашы адносіны да прыроды

**На мінулым тыдні ў Авальнай зале Дома ўрада дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу разгледзелі ў першым чытанні два законапраекты, якія датычацца захавання беларускай прыроды і выкарыстання яе рэсурсаў. Цікава, што ініцыятарамі абодвух з'яўляюцца самі дэпутаты. Размова — пра змяненні і дапаўненні ў Лясны кодэкс і пра новы закон «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях». Андрэй АБРАМЧУК, старшыня Лясной рабочай групы грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны», браў актыўны ўдзел у грамадскім абмеркаванні абодвух дакументаў, пры гэтым найбольш блізкім для сябе ён назваў будучы закон «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях». Мы распыталі эксперта, наколькі законапраект задавальняе чаканні спецыялістаў па ахове прыроды.**

— Перш за ўсё, у выніку прыняцця новага закона якасна зменіцца ахова нашых заказнікаў. У дзеючым законе прапісаны рэжымы абмежавання ў нацыянальных парках і запаведніках, а ў дачыненні да заказнікаў ніводны заканадаўчы акт у нас дагэтуль не меў пераліку абмежаванняў. Таму кожны вызначаў рэжым так, як сабе ўяўляў, і прапісваў яго ў Палажэнні аб заказніку. Гэта прыводзіла да таго, што шэраг заказнікаў фактычна не мелі рэжыму аховы альбо ён нічым не адрозніваўся ад рэжыму іншых тэрыторый.

стар. 14



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Усё паводле тэхналогій

*Спікер верхняй палаты ўзяў удзел у адкрыцці малочнатаварнага комплексу*

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ узяў удзел у адкрыцці малочнатаварнага комплексу ў гаспадарцы Мінскага трактарнага завода. Комплекс разлічаны на 777 галоў жывёлы. Яго магутнасць прадугледжвае вытворчасць больш чым 5,5 тысячы тон малака ў год.**



Фота БелТА.

Перадавыя тэхналогіі на малочнатаварным комплексе ў сельскагаспадарчым цэху «Гайна» Мінскага трактарнага завода забяспечаць высокую прадукцыйнасць. Так лічыць **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанід ЗАЯЦ.** «У гаспадарцы пабудаваны малочнатаварны комплекс з перадавымі тэхналогіямі, якія павінны забяспечыць высокую прадукцыйнасць і якасць малака, захаванасць пагалоўя. Абсталявана сучасная даільная зала, унікальныя ахаладжальнікі малака для захоўвання і далейшай адпраўкі на малочны завод. Тут светлыя памяшканні, добрыя выгульныя двары з кармавымі пляцоўкамі. Зроблена ўсё па тэхналогіі», — адзначыў Леанід Заяц.

Міністр дадаў, што ў Беларусі большасць сельгасарганізацый, якія адносяцца да прамысловых прадпрыемстваў, маюць высокія вытворчыя і якасныя паказчыкі. «Падобных філіялаў у краіне нямала. Удзячны Міністэрству прамысловасці, інтэгратарам, якія ўзялі пад крыло сельгаспрадпрыемства. Гэта быў вельмі выверany і своечасовы крок з боку дзяржавы», — сказаў ён.

## Пытанні адукацыйныя

*У Савеце Рэспублікі прайшла сустрэча з паслом Узбекістана*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ правялі сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Насірджанам ЮСУПАВЫМ.**

Падчас сустрэчы было адзначана, што паміж Беларуссю і Узбекістанам створана дастатковая нарматыўна-прававая база супрацоўніцтва ў адукацыйнай сферы: рэалізуюцца пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі паміж дзяржавамі — удзельніцамі СНД, пагадненне аб узаемным прызнанні і эквівалентнасці дакументаў аб сярэдняй (агульнай) адукацыі, пачатковай прафесійнай і сярэдняй прафесійнай (спецыяльнай) адукацыі. Сёння вядзецца сумесная работа над праектам міжведамаснага пагаднення аб супрацоўніцтве ў сферы вышэйшай адукацыі.

Абмеркаваны перспектыўныя напрамкі ўзаемадзеяння ў сферы адукацыі, у тым ліку па рэалізацыі сеткавых адукацыйных праграм паміж установамі вышэйшай адукацыі дзвюх краін у галінах IT-тэхналогій, біятэхналогій, геаінфармацыйных сістэм і камп'ютарнай бяспекі, арганізацыі навучання, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі ўзбекскіх спецыялістаў па запатрабаваных на рынку працы Рэспублікі Узбекістан спецыяльнасцях, уключаючы навучанне ў дыстанцыйнай (завочнай) форме і на англійскай мове, развіцця сумеснай навукова-даследчай і інавацыйнай дзейнасці студэнцкай моладзі дзвюх краін. Таксама ішлі перагаворы па ажыццяўленні акадэмічных і навуковых абменаў, наладжванні партнёрскіх адносін і абмене вопытам у сістэме дашкольнай, агульнай сярэдняй і інклюзіўнай адукацыі, супрацоўніцтве ў галіне арганізацыі конкурсаў прафесійнага майстэрства.

## Мала быць справядлівым

*Сенатар выступіў на пасяджэнні савета пры МАРГ*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ прыняў удзел у пасяджэнні грамадска-кансультатыўнага (экспертнага) савета пры Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.**

На пасяджэнні разгледжаны пытанні ўдасканалення заканадаўства ў галіне гандлю і грамадскага харчавання, якія датычацца павелічэння парогавага значэння долі ў тавараабароце харчовых тавараў да 35 % ці выключэння інфраструктурнага абмежавання ўвогуле. Выступаючы на мерапрыемстве, Уладзімір Панцюхоў падкрэсліў, што парламентарыяў ацэньваюць па законах, якія яны прымаюць. «А закону мала быць справядлівым. Трэба, каб яго такім лічылі людзі. Гэта галоўнае», — лічыць старшыня Пастаяннай камісіі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ШТО

## Савет Рэспублікі працягвае выязныя

**Чарговае пасяджэнне па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі на чале з кіраўніком верхняй палаты парламента Міхаілам Мясніковічам прайшло ў Ашмянскім і Астравецкім раёнах. Былі абмеркаваны шляхі фарміравання эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі, якая служыць фактарам устойлівага эканамічнага росту.**

**У семінары прынялі ўдзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў, прадстаўнікі міністэрстваў эканомікі, фінансаў, працы і сацыяльнай абароны, сельскай гаспадаркі, кіраўнікі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей.**



### Ператварыць планы ў рэальнасць

Мэта семінара — звярнуць увагу новых кіраўнікоў гарадскіх і раённых Саветаў на ўдасканальванне рэгіянальнай палітыкі. Гэта звязана з амбіцыйнымі планамі, якія кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка агучыў у Пасланні беларускаму народу і парламенту. У першую чаргу неабходна да канца наступнай пяцігодкі ўдвоіць рэгіянальны валавы прадукт, забяспечыць да 2025 года валавы ўнутраны прадукт у аб'ёме 100 млрд долараў і дасягнуць узроўню жыцця вышэйшага за сярэдні, бо пакуль гэты паказчык у параўнанні з развітымі краінамі застаецца нізкім. За восем гадоў зрабіць такі рывок вельмі складана, падкрэсліў падчас семінара **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ**. Значная роля ў гэтым адводзіцца мясцовым органам самакіравання, у першую чаргу Саветам дэпутатаў. Сёлета сфарміраваны новы дэпутацкі корпус, у гарадскія і раённыя Саветы прыйшло нямала новых кіраўнікоў. Яны павінны працаваць над тым, каб знайсці такія падыходы, якія будуць спрыяць устойліваму развіццю рэгіёнаў і фарміраванню новых пунктаў росту. Таксама вельмі важна спрагназаваць работу з улікам канкурэнтных пераваг кожнай вобласці і кожнага раёна.

З гэтай мэтай і праводзіць Савет Рэспублікі выязныя пасяджэнні ў розных рэгіёнах. Вучоба дэпутацкага корпуса ўжо адбылася ў Магілёўскай і Гомельскай абласцях. А ў канцы мінулага тыдня Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу правёў чарговае пасяджэнне на Гродзеншчыне. У ім, разам з гродзенцамі, прынялі ўдзел старшыні гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў Брэсцкай вобласці. Удзельнікі семінара наведалі Ашмянскі і Астравецкі раёны. Завяршыць вучобу дэпутатаў па дадзенай тэматыцы плануецца ў ліпені ў Барысаве, дзе будзе ўдзельнічаць актыў Міншчыны і Віцебшчыны.

> «У першую чаргу неабходна да канца наступнай пяцігодкі ўдвоіць рэгіянальны валавы прадукт, забяспечыць да 2025 года валавы ўнутраны прадукт у аб'ёме 100 млрд долараў і дасягнуць узроўню жыцця вышэйшага за сярэдні.

### Ашмяны — арыентацыя на экспарт

Адзін з самых паўночных раёнаў Гродзеншчыны — Ашмянскі — традыцыйна скіраваны на развіццё прамысловасці, зазначыў **старшыня райвыканкама Мірaслаў САРАСЕК**. Найбольш буйныя прадпрыемствы — сыраробчы завод і мясакамбінат. Абодва маюць высокі экспартны патэнцыял. Напрыклад, у «Сырнага раю» доля паставак за мяжу складае 90 %, што дае магчымасць мець рэнтабельнасць, вышэйшую за 20 %. Аб'ём паставак летась склаў каля 30 млн долараў. Два гады таму тут правялі апошнюю мадэрнізацыю з устаноўкай іспанскай лініі па выпуску паўцвёрдых сыроў малой вагі. У планах — будаўніцтва камеры паспявання сыру і рэканструкцыя цэха сепарыравання сыроваткі. Гэтыя перспектывы сведчаць аб тым, што ў прадпрыемства ёсць рэзерв, каб працаваць больш эфектыўна.

Новых партнёраў шукае Ашмянскі мясакамбінат. Зараз асноўная доля экспарту ідзе ў Расійскую Федэрацыю, але вядуцца перамовы аб пастаўках паўфабрыкатаў у Грузію, Азербайджан і Казахстан. Гатовая прадукцыя добра разыходзіцца на ўнутраным рынку, што дазваляе прадпрыемству працаваць з прыбыткам і развівацца.



# МОГУЦЬ РЭГІЁНЫ?

## пасяджэнні. Парламентарыі наведалі Гродзеншчыну




Удзельнікі семінара пакаштавалі беларускую каву. Натуральны прадукт ААТ «Белкава» закупляе ў Бразіліі і тут даводзіць да патрэбнай кандыцыі. Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Аляксандра ПАПКОВА**, прадпрыемства мае ўсе шанцы павялічыць аб'ёмы і да 2025 года ўтроіць вытворчасць. Ніш для гэтага хапае, трэба толькі ўмець іх заняць.

> Пакуль рынак працы спрыяе беспрацоўным. Так, у Гродзенскай вобласці на аднаго саіскальніка — 3,3 вакансіі. Усяго па рэгіёне — 11 тысяч свабодных рабочых месцаў, на Брэстчыне — 8 тысяч.

Зацікавіла ўдзельнікаў семінара сумеснае прадпрыемства «БелЛатГран», дзе робяць шпакоўні для розных відаў птушак. Незвычайны тавар, аказваецца, вельмі добра разыходзіцца за мяжой: заказы паступаюць з 60 краін свету. Кошт птушыных хатак вагаецца ад 5 да 50 еўра. Самы буйны партнёр — Галандыя, туды ўжо адпраўлена шпакоўняў на 176 тысяч еўра.

Новы брэнд Ашмяншчыны — турызм. Прычым тут яго развіваюць па кластэрным прынцыпе. Садзейнічае гэтаму шэраг мясцовых ініцыятыў, якія фінансуе Еўрапейскі саюз. У іх ліку — стварэнне музея «Дуга Струвэ», геадэзічныя аб'екты якога занесены ў спіс ЮНЕСКА. У кластар уваходзяць аграсядзіба «У Яніны», праект Аляксандра Варыкіша па стварэнні 3D-макетаў «Краіна замкаў», сакральны валун «Нявесцін камень», унікальнае рамство — льняныя конікі, якіх выраблялі толькі ў гэтых мясцінах.

Турыстычны патэнцыял можа стаць важнай часткай устойлівага развіцця не толькі Ашмянскага, але і іншых раёнаў, заўважыў падчас прэзентацыі Міхаіл Мясніковіч. Была выказана прапанова, каб Саветы дэпутатаў узялі гэту сферу пад сваю апеку і прымалі актыўны ўдзел у стварэнні новых кластараў, шукалі цікавыя падыходы для рэалізацыі брэндавых мерапрыемстваў.

— Кластары не патрабуюць вялікіх грошаў, але з іх з'яўленнем турыстычная прывабнасць раёна значна ўзрастае. Яны здольныя зрабіць значны ўнёсак у рэгіянальную палітыку, — адзначыў старшыня верхняй палаты парламента. Рэзервы ёсць і ў экспарце турыстычных паслуг.

### Працоўная матрыца

На думку Міхаіла Мясніковіча, на гэтым этапе няма неабходнасці прымаць рашэнні, каб павысіць аўтарытэт і ролю мясцовых Саветаў. У іх ёсць асноўны інструмент — яны зацвярджаюць бюджэт. Але трэба зрабіць мясцовыя бюджэты больш самастойнымі. Прычым гаворка ідзе не аб дадатковых падатках, а пра тыя механізмы, якія дазволяць зацікавіць рэгіёны больш зарабляць самім. На сённяшні дзень усе раёны Брэсцкай і Гродзенскай абласцей (акрамя Гродзенскага раёна) з'яўляюцца датацыйнымі. Пры гэтым пасіўнасць на месцах абумоўлена існуючымі нормамі датацый — яны змяншаюцца, калі раён самастойна зарабляе дадатковыя сродкі. Таму неабходна «ўключыць» матывацыйныя механізмы, каб рэгіёну было выгадна зарабляць самому.

Адным з такіх механізмаў з'яўляецца стварэнне новых рабочых месцаў. Прычым не проста новых, а больш эфектыўных. Падчас семінара падрабязна абмеркавалі і праблему працаўладкавання ў рамках рэалізацыі Дэкрэта № 1. Яго вынікам павінен стаць прырост занятых у эканоміцы.

Як расказаў **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Андрэй ЛАБОВІЧ**, у аснову рэдакцыі дэкрэта лёг вопыт работы камісій, якія былі ўтвораны ў мінулым годзе. У электронным варыянце распрацавана матрыца работы з базай даных працаздольных грамадзян, якія не заняты ў эканоміцы ў рэгіёнах. У праграме падрабязна распісана, як павінен фарміравацца спіс беспрацоўных, па якіх паслугах і хто канкрэтна будзе кампенсаваць затраты ЖКГ. Методыка праходзіць апрабаванне на месцах. На дадзеным этапе ідзе працэс аднаўлення камісій.

На пасяджэнні падрабязна абмеркавалі, як лепш арганізаваць іх работу. Па словах **старшыні Ашмянскага райсавета Мікалая КВЯТКЕВІЧА**, у раёне створана камісія ў складзе 17 чалавек. Мяркуецца прыцягнуць да яе работы прадстаўніка аддзела грамадзянства і міграцыі, што важна для прыгранічнага рэгіёна. Да 1 ліпеня камісія павінна распрацаваць пералік складаных жыццёвых сітуацый, скласці базу беспрацоўных, правесці работу з асацыяльнымі катэгорыямі грамадзян. Напрыклад, у Ашмянскім раёне такіх 180 чалавек.

Каб пазбегнуць у далейшым напружаных сітуацый, варта выпрацаваць свае, мясцовыя падыходы, звярнуць увагу на сем'і з дзецьмі, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Матрыцу, якая прапанавана Мінскам, трэба напоўніць сваёй канкрэтнай базай, персаніфікаваць кожнага, хто туды трапляе. З імі ў далейшым прыйдзецца даволі грунтоўна папрацаваць, бо гэта сітуацыя можа пацягнуць за сабой канфлікт інтарэсаў. Яго трэба прадухіліць, Міхаіл Мясніковіч рэкамендаваў, каб камісіі па працаўладкаванні ўзначалілі кіраўнікі адпаведных мясцовых Саветаў. Што датычыцца базы даных, яна ёсць у кожным раёне і члены камісіі павінны ведаць, хто прэтэндуе на падтрымку з бюджэту, а хто не.

Пакуль рынак працы спрыяе беспрацоўным. Так, у Гродзенскай вобласці на аднаго саіскальніка — 3,3 вакансіі. Усяго па рэгіёне — 11 тысяч свабодных рабочых месцаў, на Брэстчыне — 8 тысяч. Але ўзровень аплаты не спрыяе аптымізму. Зарплата па большасці прапанаваных вакансій не дасягае 500 рублёў.

Яшчэ адна праблема — дысбаланс попыту і прапановы. Прадпрыемствам не патрэбны тыя спецыялісты, якіх прапануе служба занятасці. На месцах гэта трэба ўлічваць і больш займацца перанавучаннем пад канкрэтнае месца працы. Андрэй Лабовіч паведаміў, што па заяўках наймальнікаў пераважна палова беспрацоўных. Гэта прыклад таго, як эфектыўна выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі.

Што датычыцца стварэння новых працоўных месцаў, то ў цэлым па краіне гэта заданне выканана, за выключэннем Брэсцкай вобласці. Разам з тым у кожнай вобласці ёсць раёны, якія з гэтай задачай не справіліся. Іх па краіне 54. Гэта 40 % ад усёй колькасці, што яшчэ раз свечыць аб тым, як працаўладкаванне можа спрыяць эканамічнаму развіццю рэгіёна.

> Кластары не патрабуюць вялікіх грошаў, але з іх з'яўленнем турыстычная прывабнасць раёна значна ўзрастае. Яны здольны зрабіць значны ўнёсак у рэгіянальную палітыку.




— У Савеце Рэспублікі створана прафесійная рабочая група, якая займаецца распрацоўкай прапаноў па адміністрацыйна-тэрытарыяльных пытаннях і рэгіянальнай палітыцы. У найбліжэйшы год плануем падрыхтаваць грунтоўны даклад з прапановамі па ўдасканаленні рэгіянальнай палітыкі, — зазначыў Міхаіл Мясніковіч.

У дакладзе будзе скарыстаны матэрыял, атрыманы падчас выязных пасяджэнняў у рэгіёны, у тым ліку як станоўчы вопыт, так і вузкія месцы ў рабоце абласцей.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

# ДАРОГІ, ІНДЫЧКІ І КІТАЙСКАЯ МЕДЫЦЫНА

## Як Гродзеншчына прыцягвае інвестыцыі?

**РАЗВІЦЦЁ рэгіёнаў немагчымае без інвестыцый. Гэта пытанне было ўзнята падчас пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, што прайшло ў Ашмянскім і Астравецкім раёнах.**

### Геаграфічнае становішча прываблівае грошы

Па словах **старшыні Ашмянскага райвыканакама Міраслава САРАСЕКА,** у раёне ажыццяўляецца 10 інвестпраектаў. У іх ліку будаўніцтва гандлёвага цэнтра, аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, гасцініц. Некаторыя з іх завершаны. У планах — рэалізацыя праектаў на двух перапрацоўчых заводах: на сыраробчым заводзе па будаўніцтве цэха паспявання сыроў і рэканструкцыі цэха сепарыравання, на мясакамбінаце — будаўніцтва цэха першаснай перапрацоўкі. Агульны кошт плануемых інвестыцый складзе каля 26 млн рублёў.

Акрамя таго, РУП ЖКГ збіраецца мадэрнізіраваць кацельную ў райцэнтры з устаноўкай катла на мясцовых відах паліва, а таксама пабудуе гарадскія ачышчальныя збудаванні за кошт крэдыту Сусветнага банка. Шэраг праектаў плануецца рэалізаваць у сферы лагістыкі — рэканструкцыя дарогі М7 і будаўніцтва сэрвіснай зоны пункта пропуску «Каменны Лог». На гэтым аб'екце будзе створана 260 працоўных месцаў.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама Галіна ЛЮТКОЎСКАЯ прэзентуе ўдзельнікам пасяджэння Савета эканамічны патэнцыял рэгіёна.**

— Не кожны раён мае такі патэнцыял, — упэўнены Міраслаў Сарасек, — нам пашанцавала з выгадным геаграфічным становішчам, праз рэгіён ідуць вялікія транзітныя патокі. Сталі традыцыйнымі інвестфорумы «Паўночны вектар».

Зараз вядуцца перамовы па продажы былога льнозавода, які быў закрыты паўтара года таму. Расійскі інвестар мае намер не толькі арганізаваць вытворчасць па перапрацоўцы льну, але і па яго вырошчванні ў раёне.

### Як рэалізаваць амбіцыйныя планы?

На думку **старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА,** стаўку трэба рабіць на замежныя інвестыцыі.

— Інвестыцыйная дзейнасць — гэта тое, што можа забяспечыць рост валавога ўнутранага прадукту (далей — ВУП), у структуры ВУП яна павінна займаць 25 %, — падкрэсліў спікер. — Трэба на месцах ствараць усе ўмовы, каб інвестыцыйныя праекты рэалізоўваліся эфектыўна.

Нагадаем, да 2025 года ўзровень ВУП краіны павінен павялічыцца ўдвая і скласці 100 млрд долараў у эквіваленце — такую амбіцыйную задачу кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка агучыў падчас Паслання беларускаму народу і парламенту.

Як падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч, інвестыцыйныя праекты павінны быць інавацыйнымі па сутнасці: нельга ўвесь час выходзіць на сусветныя рынкі з аднымі і тымі ж таварамі:

— Кожны рубель павінен быць інавацыйным, што дазволіць трымаць канкурэнтаздольнасць эканомікі, — падкрэсліў спікер, — бо немагчыма нарошчваць экспарт на старой прадукцыі, а ў нас пакуль аб'ём новай высокатэхналагічнай прадукцыі ў экспарце невысокі — 33 %, у той час як у былых суседак па сацыялістычным лагеры гэты паказчык значна вышэйшы: у Венгрыі — 69 %, Славакіі — 67 %, Чэхіі — 64 %, Польшы — 51 %.

Між іншым, як падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ,** каб дастойна канкурыраваць на сусветных рынках, трэба шукаць прарыўныя тэхналогіі.

### Цалкам рэальная задача

Гродзеншчына прывабная для інвестара. І мінулая пяцігодка сведчыць аб актывізацыі гэтага сектара эканомікі. Інвестыцыі выраслі і ў апошнія гады складаюць да 40 % ад валавога рэгіянальнага прадукту, адзначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.**

Значную частку ўносіць, вядома, будаўніцтва Беларускай АЭС. Але ёсць нямала і іншых буйных праектаў. І гэта, у першую чаргу, будаўніцтва аўтамагістралі М6 — інфраструктурны праект, які зробіць сур'ёзны ўнёсак у эканоміку рэгіёна. Шэраг праектаў рэалізуюць некалькі замежных кампаній. У прыватнасці, расійская кампанія ў пачатку года запусціла ў Смаргоні завод па перапрацоўцы алейных культур. Ёсць прапанова пабудаваць яшчэ адно прадпрыемства па паглыбленай перапрацоўцы соі і атрымаць прадукт для фармацыі, кандытарскай прамысловасці. У Смаргоні развіваецца і кампанія «Кронаспан», кожны год адкрываючы новую вытворчасць. Цяпер гэты інвестар упадабаў і Свіслач, дзе кампанія збіраецца будаваць завод. Уласнікі маюць намер ствараць кластар з замежнымі прадпрыемствамі.

У Гродне кітайскі інвестар укладае 15 млн долараў у мадэрнізацыю самай высокай гасцініцы, нядаўна кампанія адкрыла цэнтр кітайскай медыцыны. Стабільна працуе літоўская кампанія ARVI па вытворчасці мяса індычак, у планах — развівацца па іншых кірунках.

Па словах Уладзіміра Краўцова, у эканоміцы рэгіёна расце доля малых і сярэдніх прадпрыемстваў, дзякуючы «бязвізу» актыўна пачаў развівацца турыстычны бізнес — гэта, можна сказаць, рэгіянальная асаблівасць.

Што датычыцца павелічэння ўдвая паказчыка валавога прадукту ў рэгіёне да 2025 года, то эканамічны блок аблвыканкама ўжо падлічыў, што гэта цалкам рэальная задача, у тым ліку дзякуючы рэалізацыі пералічаных вышэй праектаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА, Маргарыта УШКЕВІЧ.**

АГРАРНЫ ВЕКТАР

# КУДЫ ПАБЕГЛА МАЛАКО?

**НА пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў апынулася таксама тэма мадэрнізацыі і рэканструкцыі малочнатаварных фермаў і вынікаў дзейнасці малочнай жывёлагадоўлі. А паколькі тут сабраліся прадстаўнікі Брэстчыны і Гродзеншчыны, асноўны акцэнт быў зроблены менавіта на гэтыя рэгіёны.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### Змены ў тройцы лідараў

Як паведаміў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Ігар БРЫЛО,** сёння малочная жывёлагадоўля ў краіне з'яўляецца адной з асноўных і эфектыўных галін. У гаспадарках краіны летась выраблілі 6989,3 тысячы тон малака, што больш на 222,9 тысячы тон, чым у 2016 годзе. Ва ўсіх абласцях краіны (за выключэннем Віцебскай) павялічылася вытворчасць і рэалізацыя малака.

Гэта адбылося за кошт павелічэння прадукцыйнасці дойнага статку пры невялікім павелічэнні колькасці малочных кароў. І калі ў 2014 годзе паказчык прадукцыйнасці складаў 4508 кілаграмаў малака, то ў 2017-м упершыню ён перавысіў пяцітысячны рубеж і склаў 5005 кілаграмаў малака. Значны ўнёсак у гэта зрабілі флагманы аграрнай галіны — гаспадаркі Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей. Менавіта ў такой паслядоўнасці і размеркаваліся месцы ў рэйтынгавай табліцы па выніках 2017 года. Аднак ужо за чатыры месяцы на «малочным» алімпе адбыліся змены: Брэсцкі рэгіён утрымаў лідарства, а Гродзеншчына ўступіла другую прыступку Міншчыне.

У Ашмянскім і Астравецкім раёнах, дарэчы, дзе праходзіла пасяджэнне Савета, таксама адбылося зніжэнне ў адмысловым рэйтынгу. Астравецкі раён з леташняга 20-га месца (сярод 118 раёнаў) па выніках чатырох месяцаў 2018-га ўжо займае 25 месца, а Ашмянскі — з 74-га апусціўся на 82-е.

Як растлумачыў **старшыня Ашмянскага райвыканкама Міраслаў САРАСЕК,** гаспадаркі займае каля 20 % у структуры валавой дабаўленай вартасці раёна. Дарэчы, з васьмі гаспадарак сем знаходзяцца ў працэдуры аздараўлення, пяць з якіх — у працэдуры санацыі.

— У дзвюх з пяці становішча палепшылася, у астатніх трох вядзецца дадатковая работа па пошуку стратэгічных інвестараў. Інтарэс з іх боку ёсць, а вось рэальных крокаў пакуль няма, — адзначыў кіраўнік раёна.

Між іншым, як падкрэсліў **старшыня верхняй палаты парламента Міхаіл МЯСНІКОВІЧ,** па малочнай жывёлагадоўлі да раёна пытанняў хапае: напрыклад, ёсць цэлы шэраг мадэрнізаваных сучасных фермаў, дзе надої ніжэй за агульнарэспубліканскі паказчык. Здаецца, пераводзім жывёлу на новыя комплексы, а аддачы не маем.

### Правіла трох «К»

— Дзе малако? — задаў амаль рытарычнае пытанне старшыня Савета Рэспублікі.

Вядома, што ў каровы на языку... Таму нялішнім будзе нагадаць вядомае аграрыям правіла трох «К»: карова, кармы і кадры. Дык вось з гэтымі складнікамі поспеху ў раёне існуюць праблемы: не хапае спецыялістаў, якасных кармоў, таму і вынік ад кароўкі слабы — сёлета за чатыры месяцы толькі 28 % малака было рэалізавана класам экстра, прычым гэты паказчык ніжэйшы за леташні.

— Першапачатковая задача — накарміць жывёлу — сёння не вырашана: кармамі трэба займацца сістэмна, — акцэнтаваў увагу кіраўніцтва раёна **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ.**

Дарэчы, па інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, для таго каб забяспечыць вытворчасць плануемых аб'ёмаў жывёлагадоўчай прадукцыі сёлета ў сельскагаспадарчых арганізацыях краіны, трэба нарыхтаваць травяных кармоў не менш за 9117 тысяч тон. Па даных на 14 чэрвеня, на адну ўмоўную галаву жывёлы было назапашана 4,9 цэнтнера кармавых адзінак, што на 2,1 цэнтнера вышэй, чым у адпаведны леташні перыяд.

### Кластарны падыход

Невысокія надоі, безумоўна, не могуць не ўплываць на работу прадпрыемстваў перапрацоўкі. Па словах **дырэктара Ашмянскага сыраробчага завода Івана ГІНЬКО,** дэфіцыт сыравіны на цяперашні момант складае каля 20 %.

Як адзначыў Аляксандр Папкоў, аналізуючы работу аграрнага сектара, сёння перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі несістэмная. На яго думку, неабходна ствараць моцныя харчовыя кампаніі, бо менавіта цяпер трэба думаць, якім чынам фарміраваць эканоміку раёна.

**Толькі лічбы**

**Сёння ў Беларусі дзейнічаюць 1643 мадэрнізаваныя малочнатаварныя фермы (40 % ад усіх, што ёсць у краіне). На іх размешчана больш за палову пагалоўя дойнага статку і вырабляецца 62 % малака ад агульнай яго вытворчасці.**

Можа настаў момант для рэалізацыі кластарнага падыходу? Менавіта аб гэтым, згадваючы вопыт Узбекістана, расказаў Міхаіл Мясніковіч. Гаворка аб адмысловым аб'яднанні, у якім будуць у адзінай суполцы перапрацоўшчык, вытворца сыравіны і маркетолаг.

Напрыканцы адзначым, што Савет Рэспублікі адной з тэм выязнога пасяджэння невыпадкова абраў павышэнне эфектыўнасці малочнай жывёлагадоўлі на новых і мадэрнізаваных фермах краіны, бо ў хуткім часе сваё бачанне і прапановы Міхаіл Мясніковіч агучыць кіраўніку дзяржавы.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Ірына РАМБАЛЬСКАЯ:

# «НЕ КОЖНЫ ПАСТАВІЦЬ ДОМА МАЮ СКУЛЬПТУРУ»

**Тэлевядучая, актрыса, мадэль, пераможца конкурсаў прыгажосці Ірына РАМБАЛЬСКАЯ мае і яшчэ адно даволі нечаканае амплуа — скульптар. Прычым хобі ператварылася ўжо ў нешта большае — на мінулым тыдні, напрыклад, работы Ірыны ўвайшлі ў дзясятку найлепшых на прэстыжным конкурсе «Арт-рэзідэнцыя ў Лондане». З паўтары тысячы ўдзельнікаў — еўрапейскіх скульптараў — беларуска ўвайшла ў дзясятку фіналістаў! Аб захапленні скульптурай, тэлебачаннем, выхаванні дачкі і месцы гламуру ў жыцці мы паразмаўлялі з Ірынай.**

***— Большасць гледачоў ведаюць вас усё ж як вядучую. Прычым адну з самых пазнавальных на СТБ. Колькі вы працуеце на тэлеканале?***

— Ужо 12 гадоў. Прычым мой шлях у журналістыку быў доўгі: я спачатку скончыла юрыдычны факультэт БДУ.

***— Напэўна, з чырвоным дыпломам?***

— Так. Сіндром выдатніцы ў мяне на працягу ўсяго жыцця і вельмі мне замінае. Журфак заўсёды быў ружовай марай, таму пасля юрыдычнага я вырашыла яе ажыццявіць і паступіла. Прыйшла на першую практыку на СТБ карэспандэнтам, тут і засталася. Убачыўшы мяне, адразу прапанавалі здымаць сюжэты пра культуру, але я сказала, што цікава эканоміка. Пачынала карэспандэнтам, пасля працавала і ў прэзідэнцкім пуле, у навінах, асвятляла сур'ёзныя тэмы. Праз 2—3 гады пачала працаваць у праграме «Сталічныя падрабязнасці». З гэтага часу пачаўся медыйны складнік маёй прафесіі, хоць медыйнасць ніколі не была для мяне прыярытэтам. Нават зараз тое, што на экране — вяршыня айсберга. Мне куды больш цікава іншае — тэхналагічная, рэкламныя працэсы ў тэлевытворчасці, якія для гледача не заўважныя. Эфірныя складнікі прафесіі — грым, касцюм, прыгажосць — для мяне проста пабочны эфект ад прысутнасці на тэлебачанні. СТБ адрозніваецца тым, што ў нас няма дыктарў у класічным разуменні, і гэта спрыяе развіццю асобы ў самых розных кірунках.

***— Пазнавальнасць дае ўпэўненасць, што вы не застанецеся без працы і праекты для вас заўсёды знойдуцца?***

— Зусім не. Кожны чалавек, які прыходзіць на тэлебачанне, павінен разумець, што яно жыве па сваіх законах, і быць проста вядучым — гэта шлях у нікуды. У такім выпадку трэба быць гатовым да таго, што ў любы момант выпадзеш з кадра. Да таго ж жаночая прыгажосць не вечная, так можна застацца ў 40 гадоў без усялякіх навыкаў і ўменняў. Экран у гэтым плане жорсткі.

***— Цяпер вы вядучая праграмы «Вялікі сняданак». У якіх праектах мы ўбачым вас у новым тэлевізійным сезоне?***

— У тэлеканала СТБ цалкам зменіцца канцэпцыя, і я як вядучая і прэс-сакратар тэлеканала ўдзельнічаю ў распрацоўцы новага кантэнту. Але пакуль не буду расказваць пра канкрэтныя праекты, але гэта будзе ў добрым сэнсе рэвалюцыя.

***— На пачатку кар'еры ў Ірыны Рамбальскай на экране быў вельмі гламурны вобраз, вы былі часткай свецкіх мерапрыемстваў. А ў нейкі момант ад гэтага адышлі. Што адбылося ў вашым жыцці?***

— Вечарынкі, прэзентацыі, гламур ніколі мяне асабліва не цікавілі. Але гэта неад'емная частка мадэльнай кар'еры, якая ў мяне пачалася ў 12 гадоў. Такі мой вобраз сфарміраваўся, хоць я ад яго доўга імкнулася адхрысціцца. А потым зразумела: каб рухацца далей, трэба выкарыстоўваць тую аснову, што ёсць. Таму ў новым сезоне ад ранейшага вобраза адыходзіць не будзем, хоць ён і не супадае з маім унутраным «я». Зламаць стэрэатыпы, што я і імкнулася зрабіць усё сваё жыццё, немагчыма. Тым больш што з мадэльнай кар'ерай не завязваю, ёсць прапановы паўдзельнічаць у конкурсах прыгажосці, праўда, для больш старэйшага ўзросту. Так што мой сфарміраваны вобраз застанецца, праўда, з інтэлектуальным складнікам, які для кагосьці, магчыма, стане нечаканым.

***— Вельмі дзіўна, дарэчы, чуць ад тэлевядучай, мадэлі і ўдзельніцы конкурсаў прыгажосці, што манікюр вы можаце зрабіць і самі, масаж вас напружвае, а на SPA-працэдуры шкада часу...***

— Увесь мой догляд цяпер заключаецца ў тым, што зімой у мяне вячэрнія прабежкі, а летам — ранішнія. Зараз я прачынаюся а палове сёмай і выходжу на гадзінную прабежку. Яна, дарэчы, займае больш часу, чым зборы на працу — збіраюся я літаральна за 20 хвілін.

***— А прыгатаваць сняданак?***

— Я не снедаю з раніцы, дачка снедае звычайна ў школе, цяпер нам з гэтым дапамагае мая мама. Гэта, канешне, вялікі мінус, але апошнім часам я не гатую складаных страў, у мяне ўсё максімальна проста. Як і з доглядам за сабой — толькі прабежка. Кайф ад бегу, ад марафону, які я злавіла, зацягнуў. Той, хто паспрабаваў, ведае, што цяжка спыніцца. Перыяд адаптацыі ў мяне, дарэчы, быў доўгі. Я пачынала з 300—500 метраў, на якія не хапала дыхання. А зараз я забываю нават, колькі прабегла. Што датычыцца так званых уколаў прыгажосці, магу зрабіць іх раз у паўгода-год для жыўлення скуры, і ніякага ботаксу. У мяне ёсць касметолаг, якая бачыць мяне ад сілы два-тры разы на год. Ніякіх спецыфічных мерапрыемстваў няма. Маё хобі — скульптура — манікюру не прадугледжвае. Валасы больш не нарошчваю.

***— Такое складанае хобі, дарэчы, вымагае шмат часу. Да ўдзелу ў конкурсе ў Лондане доўга рыхтаваліся?***

— Я мала сплю і шмат працую. Змена актыўнасці вельмі дапамагае аднаўляцца. На ўдзел у «Арт-рэзідэнцыі», дарэчы, падала заяўку ў апошні дзень. Трэба было прадставіць свае работы і выставы, аўтабіяграфію, а таксама візуалізаваць праект, які я магла б увасобіць для Лондана. Я са сваіх скульптур нешта выбрала, напрыдумвала, візуалізавала ў графічным рэдактары — усё вельмі хутка. Адаслала і забыла. Не чакала, што нават у 50-ку траплю. А атрымалася, што ў дзясятку найлепшых. Вось цяпер вядзём перамовы аб спецыяльным артыкуле ў іх каталогу і навучанні ў Лондане, у Цэнтральным каледжы мастацтва і дызайну імя Святога Марціна, я марыла там павучыцца. Калі твае работы ацэньваюць прафесіяналы, гэта дае вялікі штуршок. Я адразу ж пабегла дакупляць новыя матэрыялы, каб рабіць нешта далей.

***— У вас ёсць свая майстэрня?***

— Так, але пакуль яна знаходзіцца на дачы. Матэрыялы, з якімі даводзіцца працаваць, складаныя: ёсць і небяспечныя, і таксічныя. Але цешу сябе надзеяй, што ў горадзе ў мяне таксама з'явіцца майстэрня.

***— Скульптуру вы, здаецца, нідзе спецыяльна не вывучалі...***

— І дзесьці нават рада гэтаму, хоць павучыцца ў той жа Акадэміі мастацтваў хацела б. Затое ў мяне няма страху перад нейкімі новымі матэрыяламі. Я магу купіць эпаксідны клей і ляпіць з яго. Спрабую ўсё, што можна.

***— У які момант вы зразумелі, што работы вартыя таго, каб выстаўляць?***

— Я з самага пачатку вырашыла іх выстаўляць, і тады ў мяне не было боязі, што яны недасканалыя. А цяпер, наадварот, з'явіўся страх, што работы не такія, як трэба. І я выстаўляюся ўсё меней. І ўсяляк з сабой змагаюся. Таму такія рэчы, як конкурс у Лондане, дапамагаюць ісці далей. Я вельмі няўпэўнены ў гэтых адносінах чалавек. Мяне раскрытыкаваць вельмі лёгка. Таму стараюся ніколі не чытаць каментарыі ў інтэрнэце, бо буду перажываць. З іншага боку, ніхто і дзясятай долі таго, што я сама пра сябе думаю, не напіша. Навучанне ў Лондане — гэта і магчымасць выхаду на еўрапейскі рынак. Скульптура складаная ў плане перавозкі. Калі адсылаеш работы, і Еўропа, і Амерыка зацікаўленыя, а вось з лагістыкай усё вельмі складана.

***— Вы прадаяце вашы работы?***

— Лялькі, з якіх пачыналася маё захапленне скульптурай, я прадавала ў Беларусі, і даволі паспяхова. Але я не вельмі люблю працаваць на заказ. Хоць з усімі, каго я ляпіла, я пражывала жыццё. Гэта ж месяц-два работы над тварам, над фотаздымкамі. І поўнае пагружэнне ў жыццё іншага чалавека. Гэта было цікава і прыносіла даход. Але я ўсё ж хачу рабіць штосьці менш класічнае, распаўсюджанае. І разумею, што дома ў нас не кожны паставіць тое, што мне сніцца. Еўропа ў гэтым плане мае больш шырокія погляды.

***— Якія яшчэ перамогі былі ў вашым жыцці апошнім часам?***

— Мая 10-гадовая дачка Ізабела паступіла ў гімназію-каледж мастацтваў. Прычым сёлета быў самы высокі конкурс. Яна яго вытрымала і будзе вучыцца ў тым творчым асяроддзі, у якім я заўсёды імкнулася аказацца. Выдатная школа, дзе ўрокі матэматыкі і рускай мовы разбаўленыя ўрокамі малюнка, кампазіцыі... Мой дзядуля маляваў, прыемна, што гэта традыцыя ў нашай сям'і застаецца.

***— Ведаю, што вы вельмі шмат робіце для ўсебаковага развіцця дачкі...***

— Акрамя заняткаў малюнкам, яна наведвае тэатральны гуртох, займаецца танцамі, але гэта тое, што яна сама выбрала, абавязалаўкі з майго боку няма. Прынцыповай задачай было заахвоціць яе чытаннем. Тут прыйшлося зламаць свае стэрэатыпы. Я ж хацела, каб яна чытала тое, што мне цікава. Потым вырашыла: няхай чытае хоць бы і абгорткі ад цукерак. І яна сама стала выбіраць кнігі. І тады справа пайшла прасцей.

***— Любіце кіраваць аўтамабілем?***

— Машына застаецца для мяне тым месцам, дзе я магу падумаць, адпачыць, папіць кавы, дзе знаходзяцца ўсе патрэбныя мне рэчы, туфлі і адзенне, каб пераапрануцца. Люблю ўключыць гучна музыку і накруціць пару лішніх кругоў па тых мясцінах, якія падабаюцца, каб разгрузіцца ад думак пасля працы. Марка аўтамабіля, узровень яе камфорту не маюць для мяне абсалютна ніякага значэння. Я ў быце абсалютна непатрабавальны чалавек — жыву ў кватэры ў звычайным панэльным доме. Калі ў чалавека шмат часу, магчыма, яму патрэбныя SPA-салоны, асаблівыя хатнія ўмовы. У маім выпадку я прыходжу дадому, каб перапачываць. Нават у выхадныя дома мы з Ізабелай не сядзім.

***— Як іх праводзіце?***

— Едзем на дачу, дзе я працую, а дачка малюе. У яе там ёсць ровар і ўсё неабходнае для нармальнага дачнага жыцця. У горадзе ходзім і ў кіно, на выставы, абедаем звычайна не дома. Вельмі любім падарожнічаць — раптам набыць білеты і кудысьці з'ехаць. У мяне вялізны турысцкі рукзак на 65 літраў, які мы загружаем і качуем, не прывязваючыся да аднаго месца ці гатэля. Звычайна як выйшлі з раніцы — той музей, іншы — так да вечара і гуляем. Выбіраем гасцініцу, каб яна была або з цікавым дызайнам, або ў цікавым месцы. Вось нядаўна былі ў Францыі, выбралі гатэльчык, бо прачыталі, што прасіць ежу праз акно ў нас будуць канадскія гусі, якія там жывуць.

**Алена КРАВЕЦ.**




## Рыхтуй бочкі летам! Са «Звяздой»!

**13 ліпеня сярод сваіх падпісчыкаў на трэці квартал або другое паўгоддзе «Звязда» разыграе сем дубовых бочак ёмістасцю 10 літраў і адну (суперпрыз) — ёмістасцю 30!**

**Не забудзьцеся запоўніць купон *(глядзі справа)*, выразаць яго і да 11 ліпеня даслаць у рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а. А ўжо далей...**

**Вам пашанцуе!**



***Падрабязныя правілы гульні змешчаны ў нумары за 31 мая. Тэрміны правядзення гульні — з 01.06.2018 да 30.09.2018.***

***Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3284 ад 25.05.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.***

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2018 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ________________

________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ________________
(аддзяленне сувязі)

________ на III квартал або II паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ________

________________

________________

Удачы ў розыгрышы!

## Субота, 30 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.10** «Існасць».
**6.35 Меладрама «Анёл у сэрцы» (12+).**
**8.25** «Кулінарная дыпламатыя» (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**9.45** «Здароўе» (12+).
**10.40** «Дача» (12+).
**11.20 «Як мы жылі на вайне». 1-я серыя (12+).**
**12.10** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**12.50, 22.15 Меладрама «Рэцэпт кахання» (16+).**
**15.15** «Краіна».
**15.45 Серыял «Чорная кошка» (16+).**
**21.00** «Панарама».
**21.45** «Сферы нацыянальных інтарэсаў». Дак. фільм.
**1.55** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** М/с «Фіксікі» (0+).
**7.10 Фільм для дзяцей «Тры залатыя валасы» (6+).**
**8.35, 21.55** «Тэлебарометр».
**8.40** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**9.20** «На нажах». Заключны выпуск (16+).
**10.30** «Навучы жонку рулiць» (16+).
**11.35 Камедыя «Чумавая пятніца» (12+).**
**13.30** Анімацыйны фільм «У пошуках Нэма» (0+).
**15.15** «Капейка ў капейку» (12+).
**15.50** «Паненка-сялянка» (16+).
**17.05 Драма «Разжалаваныя». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**18.55 Баявік «Джон Картэр» (12+).**
**21.15** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

**22.00** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».
**22.05 Драма «Салют-7» (12+).**
**0.10** «Арол і рэшка. Кругасветка» (16+).

### Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 14.30, 20.15** Навіны культуры.
**8.15, 14.45, 20.30** «Гэты дзень».
**8.20, 11.25** М/ф (0+).
**8.50 «Соль зямлі». Маст. фільм (12+).**
**10.00** «Беларуская кухня». Качка з дранікамі.
**10.30** «Жывая культура». Ваджэнне і пахаванне Стралы (в. Казакоўцы Балсуны, Веткаўскі раён).
**10.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.10 «Пакроўскія вароты». Камедыя (12+).**
**14.50** «Навукаманія» (6+).
**15.15** «Маладзечна-2018». Канцэрт «Мелодыя лёсу».
**16.35** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
**17.00** «Легенды кіно». Пётр Тадароўскі (12+).
**17.40 «Няўлоўныя мсціўцы». Фільм — дзецям (12+).**
**18.55 «Новыя прыгоды няўлоўных». Фільм — дзецям (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў». Маст. фільм (12+).**
**22.40** А. Залётнеў. «Міхал Клеафас Агінскі. Невядомы партрэт». Рамантычная опера.

### Беларусь 5

**6.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Гомель» — «Дынама» (Брэст).
**8.45** Фактар сілы.
**9.15** Вялікі спорт.
**10.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Фіналы.
**14.00** Трэніровачны дзень.
**14.30** Тэніс. Турнір WTA. Істбарн. Фінал.
**16.50, 20.50** Футбол. Чэмпіянат свету. 1/8 фіналу. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**18.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Тарпеда» (Мінск).
**22.50** Футбол. Дзённік чэмпіянату свету.
**23.25** Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Парыж.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**7.10 Серыял «Фантазія белых начэй» (12+).**
**9.10** М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды» (0+).
**9.30** «Неслужбовы раман Людмілы Івановай» (12+).
**10.35** «На наш густ» (12+).
**11.20** «Тэорыя змовы» (16+).
**12.15** «Віталь Саломін. «... И вагон любви нерастраченной!» (12+).
**13.15 Маст. фільм «Жанчыны» (12+).**
**15.10, 16.20** «Разам з дэльфінамі» (16+).
**17.15** «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+).
**18.15** «Сёння вечарам» (16+).
**20.00** «Нашы навіны». Суботні выпуск.
**20.45** «Метэагід».
**21.05** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**21.10 Серыял «Садовае кальцо» (16+).**
**22.20 Серыял «Адліга» (16+).**
**23.40** «Маладзёжная дыскатэка» (16+).

### СТБ

**6.00 «Студэнты-2». Серыял (16+).**
**7.35** «Эліксір маладосці» (16+).
**10.00** «Жыць у доме і іншыя карысныя рэчы» (16+).
**10.30** «Самая карысная праграма» (16+).
**11.20** «Мінск і мінчане».
**11.50 Камедыя «Няўдачлівыя» (12+).**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны» (16+).
**13.45, 0.30 Камедыя «Гусарская балада» (12+).**
**15.30** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**16.45** «Вялікі горад».
**17.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**17.40 Маст. фільм «Адзінокі востраў» (16+).**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 «Знішчальнікі. Апошні бой». Серыял (12+).**
**23.45** Дакументальны праект (16+).
**2.05** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).

### МІР

**6.00** «Як у рэстаране» (12+).
**6.30, 5.50** М/ф (0+).
**7.30** «Саюзнікі» (12+).
**8.00** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**8.30** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.00** «Культ/Турызм» (16+).
**9.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Чыста англійскае забойства» (0+).**
**13.25, 16.15, 19.15 Серыял «Кураж» (16+).**
**2.20 Маст. фільм «Тата» (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху». (16+).
**7.25 Серыял «Кранутая». (16+).**
**10.40** «Па сакрэце ўсяму свету». (12+).
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі». (12+).
**12.10** «Пяцёра на аднаго». (12+).
**13.00** «Наша справа». (16+).
**13.15** «Смяяцца дазваляецца». (16+).
**14.30 Меладрама «У цеснаце, ды не ў крыўдзе». (12+).**
**16.40 Маст. фільм «Пластмасавая каралева». (12+).**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55 Маст. фільм «За чужыя грахі». (12+).**
**22.30 Маст. фільм «Трымай мяне за руку». (16+).**

### НТБ—Беларусь

**6.15** «Астрапрагноз».
**6.20 Серыял «Час Волкава». (16+).**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «НЗ.by».
**8.55** «Урачэбныя тайны плюс». (12+).
**9.25** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+).
**10.25** Галоўная дарога. (16+).
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая». (12+).
**12.05** Кватэрнае пытанне. (0+).
**13.10** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**14.00 Маст. фільм «Грамазека». (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+).
**17.15** «Гарачы на мільён». Бедрас Кіркораў. (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05 Серыял «Пляж. Гарачы сезон». (12+).**
**23.30 Серыял «Казакі». (16+).**

### 8 канал

**9.00, 18.55, 21.10, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**9.15** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**9.20** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**9.30 Серыял «Англійскае забойства» (12+).**
**11.10 Драма «У імя канца ўсіх войнаў» (16+).**
**13.10 Драма «Заплаці іншаму» (12+).**
**15.15 «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Прыгоды Браткі Труса».**
**16.30** «Здароўе».
**17.15 Камедыя «Шэсць дзён, сем начэй» (16+).**
**19.00 Камедыя «Фантамас» (12+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.15 Драма «Трэнер Картэр» (16+).**

---

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер» (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**7.30** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**8.00** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**9.00, 3.20** М/ф «Дуда і Дада» (0+)
**9.25, 3.40** М/ф «Смяшарыкі» (0+)
**9.50** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+)
**10.20** «Ералаш» (6+).
**11.00** Анімацыйны фільм «Дзікая сямейка Торнберы» (6+).
**12.40** «Вакол свету падчас дэкрэта» (12+).
**13.20** Серыял «Мамачкі-3» (16+).
**15.30** Фэнтэзі «Апошні паляўнічы на ведзьмаў» (16+).
**17.40** Фантастыка «Дзеці шпіёнаў 4D» (12+).
**19.30, 21.40** «Уральскія пельмені» (16+).
**23.20** Жахі «Калі звоніць незнаёмец» (12+).
**1.10** «Мужчынская справа» (16+).
**1.40** «Хачу верыць!» (16+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

### Культура

**6.30** Біблейскі сюжэт.
**7.05** «Цырк запальвае агні». Маст. фільм.
**8.20** «Снежная каралева». М/ф.
**9.20** «Звычайны канцэрт».
**9.50** «Мост Ватэрлоа». Маст. фільм.
**11.35, 1.00** «Гісторыі малпы па імені Канель». Дак. фільм.
**12.25** «Міфы Старажытнай Грэцыі». Дак. серыял.
**12.55** «Нашых песень дзіўнае жыццё».
**13.45** «Інспектар Гул». Маст. фільм.
**16.05** З калекцыі тэлеканала «Культура». Вялікі балет-2016.
**18.10** «Гісторыя моды». Дак. серыял.
**19.05** «Усім — дзякуй!» Маст. фільм.
**20.40** «Федэрыка Феліні і Джульета Мазіна». Дак. фільм.
**21.25** «Каралеўскае вяселле». Маст. фільм.
**23.00** «Queen. Дні нашага жыцця». Дак. фільм. (18+).
**1.55** Па слядах тайны. «Калі на Зямлі кіравалі багі».
**2.40** «Рыцарскі раман». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Ілавая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока. Аляксей Хвасценка». 2006 год (16+).
**6.55, 8.25, 9.40, 11.00, 11.40, 13.05, 14.25, 15.40, 19.20. 20.30, 23.15, 0.50, 2.30, 3.40, 5.00, 5.45** Музычная настальгія (12+).
**7.20, 13.30, 1.20** Маст. фільм «Прафесія — следчы» (16+).
**8.50, 2.50** М/ф «Бюро знаходак» (0+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.30** Маст. фільм «Матылёк» (12+).
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год. 1989. 2-я частка. 2010 год (12+).
**14.35** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год (12+).
**16.00** «Колба часу» (16+).
**17.00** «Гэты фантастычны свет». 1979 год (12+).
**18.00** Маст. фільм «Падкідыш» (12+).
**19.40** Дак. фільм «Двары нашага дзяцінства». 1-я серыя (12+).
**21.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**22.00** Маст. фільм «Не сышліся характарамі» (16+).
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццяной Візбар. 2007 год (12+).
**5.20** Маст. фільм «Страказіныя крылы» (12+).

### EuroSport 1

**4.00** Алімпійскія гульні. «Зала славы».
**6.00, 10.00** Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
**7.00. 2.30** Веласпорт.
**9.30** «Гісторыі чэмпіёнаў».
**10.30, 13.30, 15.30, 16.00, 19.00, 20.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс» — 2017.
**15.55** «Галоўны па футболе». Эрык Кантана.
**21.15** Конны спорт. Global Champions Tour.
**23.30** Watts.
**23.45** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**1.55** Футбол. «Яго вялікасць футбол».

### Кінакамедыя

**0.40** Мой хлопец — кілер. (16+).
**2.30** Як выйсці замуж за мільярдэра. (16+).
**4.15** Забойства на траіх. (12+).
**8.15** Заяц над бездаННю. (12+).
**10.05** Каханне з перашкодамі. (16+).
**12.10** Правілы жыцця французскага хлопца. (16+).
**14.00** Аднакласнікі. (12+).
**15.50** Парк культуры і адпачынку. (18+).
**17.50** Дачка майго боса. (12+).
**19.30** Факап, або Горш не бывае. (16+).
**21.40** Мігатлівыя агні. (16+).
**23.50** Я выйшла замуж за прыдурка. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**10.30** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**11.20, 2.00** «Аварыя». Серыял (12+).
**14.55** «Тайны нашага кіно. «Будзьце маім мужам» (12+).
**15.25** «Будзьце маім мужам». Меладрама (12+).
**17.05** «Брыдкі Я». Анімацыйны фільм (0+).
**18.45** «10 самых» (16+).
**19.20** «Вокладка» (16+).
**19.55** «Выхаванне і выгул сабак і мужчын». Меладрама (12+).
**21.55** «Каардынаты «Скайфал». Баявік (16+).
**0.25** «Грань». Серыял (16+).
**5.15** «Нераскрытыя тайны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 15.45** Скіўцы (16+).
**8.40** Дывергент (12+).
**11.25** Ілгун, ілгун (12+).
**13.15** Жонка наглядчыка заапарка (16+).
**18.10** Эван Усемагутны (12+).
**20.10** Калі свякроў — монстр (16+).
**22.10** Дывергент-2: інсургент (12+).
**0.25** Хуткі і мёртвы (16+).
**2.25** Ірацыянальны чалавек (18+).
**4.00** Ла-Ла Лэнд (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Службовы раман. Наш час (16+).
**8.10** Код апакаліпсісу (16+).
**10.20** Пра любоў (16+).
**12.35** Масква—Касіяпея (6+).
**14.20** Жара (16+).
**16.20** Чыстае мастацтва (16+).
**18.20** Міфы (16+).
**20.20** Дзень радыё (16+).
**22.20** Мафія: гульня на выжыванне (16+).
**0.20** Герой нашага часу. (12+).
**2.20** З пяці да сямі (18+).
**4.20** Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).

### National Geographic

**6.00** Аўта-SOS. (12+).
**7.35, 23.40** Рэкорд. (12+).
**8.30, 11.00** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**9.20, 3.55** Цуды інжынерыі. (12+).
**10.10** Інжынерныя ідэі. (12+).
**12.30, 0.40** Інстынкт выжывання. (16+).
**13.15** Золата Юкана. (12+).
**14.00** Асушыць Вялікія Азёры. (12+).
**14.45** Асушыць акіян: глыбакаводныя загадкі. (12+).
**15.30, 19.35** Экстрэмальны футбол у Расіі. (12+).
**16.25, 2.15** Дзікі тунец. (12+).
**18.00, 22.00, 1.25, 4.45** Настольная кніга дыктатара. (16+).
**18.45** 80-я. Найвялікшыя футбольныя моманты (12+).
**20.25** Геній: Пікаса. (16+).
**21.15** Геній: Эйнштэйн. (16+).
**22.55** Марадона. (16+).
**5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).

### Discovery

**8.00** Выжыць у цэмры.
**9.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі.
**10.00** Тэхаскі метал.
**11.00** Вулічная навука.
**12.00** Як працуюць машыны.
**13.00, 7.10** Навуковыя прыколы.
**14.00, 17.30** Маланкавыя катастрофы.
**18.00, 21.30** Паляўнічыя на склады.
**22.00, 0.30** Паляўнічыя на рэліквіі.
**1.00** Турбадуэт.
**2.00** Дарога да прыбытку.
**4.40** Выжыць разам.

---

## Смачна есці!

### Мышы пагрызлі мільён

**Мышы часткова знішчылі запас купюр у адным з банкаматаў у Індыі, паведамляе India Today.**



Інцыдэнт адбыўся ў горадзе Цінсукія, штат Асам. Банкамат, які належыць дзяржбанку Індыі, перастаў працаваць. Праз некалькі тыдняў супрацоўнікі вырашылі адкрыць і праверыць апарат. Аказалася, што вялікая колькасць грошай была знішчана мышамі. Усяго ў банкамаце ўтрымлівалася 2 мільёны 948 тысяч рупій (каля 93 000 беларускіх рублёў) у асноўным банкнотамі па 500 і 2000. Мышы пагрызлі купюры агульным коштам 1 мільён 238 тысяч, прычым разарвалі грошы на драбнюткія кавалачкі.

### Рэстаран прагарэў на скнарах

**Кітайскі рэстаран, які прапанаваў наведвальнікам неабмежаваную колькасць ежы, згалеў за два тыдні і залез у даўгі, паведамляе South China Morning Post.**



Установа пад назвай Jiamenery кітайскім Чэнду, правінцыя Сычуань, прапаноўвала наведвальнікам з'есці ўсё што заўгодна за 120 юаняў у месяц (каля 36 рублёў). Для таго каб скарыстацца прапановай, трэба было набыць членскую картку. У выніку візіцёры прыняліся выкарыстоўваць адзін купон на цэлыя сем'і. У выніку рэстаран завінаваціўся 500 тысяч юаняў (каля 150 000 рублёў) і быў вымушаны закрыцца. Адзін з уладальнікаў прызнаўся, што такім чынам хацеў прыцягнуць і ўтрымаць лаяльных наведвальнікаў і хутка абысці канкурэнтаў. Пасля аб'явы аб акцыі кожны дзень установу наведвалі не менш за 500 кліентаў, чэргі каля дзвярэй выстройваліся з раніцы, а апошнія пакідалі рэстаран за поўнач.

### Мегасняданак ніхто не змог з'есці

**Кавярня ў англійскім Данкастэры, графства Саўт-Ёркшыр, прапанавала наведвальнікам адолець гіганцкі англійскі сняданак, які складаецца з 65 частак, піша Mirror.**



Страва пад назвай «Тэрмінатар 2» уключае ў сябе восем традыцыйных кампанентаў англійскага сняданку, у тым ліку бекон, сасіскі і яйкі, а таксама вялікую колькасць фасолі і тосты. Нягледзячы на вялізарныя памеры, яна каштуе 15 фунтаў стэрлінгаў (каля 40 рублёў). У кавярні ўжо існавала паменшаная версія «Тэрмінатар» коштам у 7,95 фунта стэрлінга (21 рубель) з чатырох кампанентаў, але наведвальнікі хутка распраўляліся з ёй. Пакуль ні адзін з тых, хто замовіў «Тэрмінатар 2», не змог даесці яго, адзначылі ва ўстанове. Чалавеку, які зможа адолець мегасняданак, абяцаюць месца на сцяне славы кавярні.

**Іван КУПАРВАС.**

# «ЁН ПАЛЯЦЕЎ, АЛЕ АБЯЦАЎ ВЯРНУЦЦА...»

## Савецкаму Карлсану — 50 гадоў



Забаўнага, безжурботнага і часам не ў меру гарэзлівага, затое «ў меру ўкормленага мужчыну ў самым росквіце сіл» шведская пісьменніца Астрыд Ліндгрэн прыдумала яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. З таго часу пра Карлсана не адзін раз спявалі, здымалі кіно, малявалі мультфільмы, ставілі спектаклі і нават... балет. Але менавіта савецкі мультфільм «Малыш і Карлсан», які выйшаў на экраны ў 1968-м, зрабіў чалавечка з прапелерам любімым персанажам мільёнаў дзяцей і дарослых. Экранізацыя прывяла ў захапленне і саму пісьменніцу, а падчас візіту ў СССР яна асобна пажадала сустрэцца з Васілём Ліванавым, які агучыў Карлсана... У гонар юбілею «Звязда» сабрала некаторыя цікавыя факты, звязаныя з мультфільмам.

У 1968 годзе выйшлі адразу два першыя мультфільмы пра Карлсана: адзін у Чэхаславакіі, другі — у СССР. Работу чэшскіх мультыплікатараў гісторыя практычна не захавала, а савецкая версія, дзе для малявання ўпершыню быў выкарыстаны прыём электраграфіі, стала адной з найлепшых у свеце. Што цікава, першы мастацкі фільм — «Самы лепшы ў свеце Карлсан», зняты сумесна Швецыяй і Германіяй, выйшаў толькі ў 1975-м, а ў савецкі пракат трапіў яшчэ на пяць гадоў пазней.

Васіль Ліванаў заўважыў падчас прагляду эскізаў, што яго героі падобны на вядомага рэжысёра Рыгора Рашаля, таму вобраз Карлсана атрымаўся шмат у чым пародыяй на канкрэтнага чалавека. На прэм'еры мультфільма рэжысёр спачатку няк не мог уцяміць, чаму зала з яго смяецца, а дазнаўшыся праўду, даслаў акцёру паштоўку з подпісам: «Рашаль, які жыве на даху».

У ролі Фрэкен Бок рэжысёр Барыс Сцяпанцаў бачыў толькі Фаіну Ранеўскую, але актрыса доўгі час адмаўлялася, бо крыўдавала на знешняе падабенства з «домамучыцелькай». У выніку яна прыступіла да работы, але... выгнала рэжысёра са студыі падчас агучвання і заявіла, што лепш ведае, як усё зрабіць.

І толькі Клара Румянава, галасам якой размаўляюць больш як 300 персанажаў савецкіх мультфільмаў, агучыла свайго Малыша без ніякіх «але».

Дарэчы, менавіта акцёры прыдумалі значную частку крылатых фраз, накшталт «А ў вас малако пабегла», «Скажы мне, мілае дзіця, у якім вуху ў мяне гудзе?» або «Справа жыццёвая», якіх не было ў сцэнарыі.

Акрамя музыкі Генадзя Гладкова, у мультфільме падчас пагоні за зладзеямі гучыць мелодыя, не згаданая ў цітрах. Гэта House of Horrors Мерва Грыфіна — выкананая аркестрам у рытме твіста апрацоўка знакамітых «Скокаў Смерці» Сен-Санса і жалобнага маршa Шапэна (!).

У 1970 годзе выйшаў працяг мультфільма — «Карлсан вярнуўся». У планах была і трэцяя частка: пустая стужка, падпісаная «Карлсан зноў гарэзіць», захоўвaецца на студыі дагэтуль. «Саюзмультфільм» з 2013 года вядзе перамовы са спадчыннікамі Астрыд Ліндгрэн наконт далейшай экранізацыі прыгод Малыша і Карлсана — магчыма, у выглядзе серыяла

## Нядзеля, 1 ліпеня

### Беларусь 1

**6.15 Серыял «Таткі» (16+).**
**7.10, 22.10 Меладрама «Анёл у сэрцы» (12+).**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.45** «Як мы жылі на вайне». 2-я серыя (12+).
**10.25** «Народная раніца» (6+).
**11.05** «Вакол планеты».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**13.15 Меладрама «Рэцэпт кахання» (16+).**
**15.15** «Твой горад».
**15.30 Серыял «Чорная кошка» (16+).**
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** «Галоўны эфір».

### Беларусь 2

**7.00** М/с «Фіксікі» (0+).
**7.30 Камедыя «Чумавая пятніца» (12+).**
**9.10, 20.05** «Тэлебарометр».
**9.15** «Свет навыварат. Непал» (16+).
**10.25** «Навучы жонку рульць» (16+).
**11.35** «Спатканне для мамы» (12+).
**12.45** М/с «Качыныя гісторыі» (0+).
**14.00** Анімацыйны фільм «У пошуках Доры» (0+).
**15.45 Драма «Салют-7» (16+).**
**17.50** «Бітва экстрасэнсаў. 16-ы сезон» (16+).
**20.45** «Паненка-сялянка» (16+).
**22.00** «Спортлато 5 з 36», «КЕНО».
**22.05 Дэтэктыў «Смерць шпіёнам!» 1—4-я серыі (12+).**

### Беларусь 3

**7.30** «Святыні Беларусі».
**7.55, 20.15** Навіны культуры.
**8.10, 20.30** «Гэты дзень».
**8.15** М/ф (0+).
**8.50, 21.05 «Юлька». Меладрама (12+).**
**10.05** «Наперад у мінулае».
**10.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.25** «Майстры і куміры». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Алег Мельнікаў.
**12.20 «Няўлоўныя мсціўцы». Фільм — дзецям (12+).**
**13.35 «Новыя прыгоды няўлоўных». Фільм — дзецям (12+).**
**14.50** «Жывая культура». Ваджэнне і пахаванне Стралы (в. Казацкія Балсуны, Веткаўскі раён).
**15.20** «Эти глаза напротив...» Вечар памяці Валерыя Абадзінскага.
**16.45 «Каханне з акцэнтам». Камедыя (12+).**
**18.30 «Соль зямлі». Маст. фільм (12+).**
**19.35** «Легенды кіно». Пётр Тадароўскі (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.20** «І класіка, і джаз». Канцэрт піяніста-віртуоза Дзяніса Мацуева.

### Беларусь 5

**7.05, 10.15, 16.50, 21.15** Футбол. Чэмпіянат свету. 1/8 фіналу. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**9.10, 22.50** Футбол. Дзённік чэмпіянату свету.
**9.45** Трэніровачны дзень.
**12.15** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Тарпеда» (Мінск).
**14.15** Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга. Парыж.
**16.20** Гульні «навырaст».
**18.50** Піт-стоп.

**19.25** Баскетбол. Кваліфікацыя да ЧС-2019. Мужчыны. Іспанія — Беларусь.
**23.25** Вынікі тыдня.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**7.10 Серыял «Фантазія белых начэй» (12+).**
**9.10** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.25** «Здароўе» (16+).
**10.35** «Адгадай мелодыю» (12+).
**11.15** Алег Відаў. «З табой і без цябе» (12+).
**12.15** «Слова гонару» (12+).
**13.05** «Анастасія Вярцінская. Якая бяжыць па хвалях» (12+).
**14.05 Маст. фільм «Чалавек-амфібія» (12+).**
**16.20** «Вялікія гонкі» (12+).
**17.25** «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+).
**18.20** «Зоркі пад гіпнозам» (16+).
**20.00** Контуры.
**21.05** «Манна для Паднябеснай».
**21.30** Музычная прэмія «Гарачыня».
**23.20** «Што? Дзе? Калі?» Летняя серыя гульняў (12+).

### СТБ

**6.20 «Студэнты-2». Серыял (16+).**
**7.55** «Скардзіцца дазваляецца».
**8.15** «Эліксір маладосці» (16+).
**9.55, 20.35 «Знішчальнікі. Апошні бой». Серыял (12+).**
**13.30, 16.30** «24 гадзіны».
**13.45, 0.00 «Маст. фільм «Іванава дзяцінства» (16+).**
**15.30, 1.35** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».

**17.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**17.35 Меладрама «Салодкае развітанне Веры» (12+).**
**19.30** «Тыдзень».

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.10, 7.00** М/ф (0+).
**6.30** «Такія дзіўныя» (16+).
**7.25 Маст. фільм «Каханая жанчына механіка Гаўрылава» (0+).**
**9.00** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.30** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Як у рэстаране» (12+).
**10.45, 16.15, 19.30, 1.00 Серыял «Дрэнная кроў» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам».
**3.00** «Любімыя акцёры 2.0» (12+).
**3.25 Серыял «Кураж» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** Пакой смеху. (16+).
**7.35** Маст. фільм «Трымай мяне за руку». (16+).
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.20** «Сам сабе рэжысёр». (16+).
**12.15** «Ранішняя пошта». (16+).
**13.00** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна». (16+).
**13.30** «Калі ўсе дома». (12+).
**14.30** «Смяяцца дазваляецца». (16+).
**16.05 Камедыя «Утаймавальніца тыграў». (12+).**
**18.00 Маст. фільм «Крылы анёла». (16+).**
**20.00** Весткі тыдня.
**21.45 Дэтэктыў «Нікому не кажы». (12+).**
**0.55** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.25** «Астрапрагноз».
**6.30 Серыял «Час Волкава». (16+).**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Аднойчы...» (16+).
**9.00** «Іх норавы». (0+).
**9.20** «Хто ў доме гаспадар?» (16+).
**10.25** «Першая перадача». (16+).
**11.00** «Цуд тэхнікі». (12+).
**11.55** «Дачны адказ». (0+).
**13.00** «НашСпажыўНагляд». (16+).
**14.10 Маст. фільм «Госць». (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+).
**18.10** «Новыя рускія сенсацыі». (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.05 Серыял «Пляж. Гарачы сезон». (12+).**
**23.40 Серыял «Казакі». (16+).**

### 8 канал

**9.00, 15.25, 18.15, 20.45, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**9.15** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**9.45** «Сад і агарод».
**10.00 Драма «Кромовъ» (16+).**
**12.00 Драма «Заказ» (18+).**
**13.25 Камедыя «Клетка для птушак» (16+).**
**15.30** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**15.35 «Глядзім усёй сям'ёй». Фільм — дзецям «Прыгоды Гекльберы Фіна» (12+).**
**17.25 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**18.20 Драма «Ідэальны шторм» (16+).**
**20.35** «Вечарніца» (0+).
**20.50 Вестэрн «Кошка Балу» (12+).**
**22.20 Камедыя «Тытунёвы капітан» (0+).**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер» (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**8.00, 0.00** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**9.00, 3.00** М/ф «Дуда і Дада» (0+)
**9.25, 3.20** М/ф «Смяшарыкі» (0+)
**9.50, 3.40** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+)
**10.20, 19.20, 22.10** «Уральскія пельмені» (16+).
**11.00** «Мужчынская справа» (16+).
**11.30** «Галерэя прыгажосці» (12+).
**12.00** «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
**13.00** Серыял «Мамачкі-3» (16+).
**15.10** Анімацыйны фільм «Буслы» (6+).
**17.00** Фэнтэзі «Хелбой: герой з пекла» (12+).
**21.00** Баявік «Тэрмінатар-2: судны дзень» (16+).
**0.00** Вестэрн «Джанга вызваленая» (18+).
**3.00** «Вакол свету падчас дэкрэта» (12+).
**3.30** «Ералаш» (6+).
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

### Культура

**6.30** «Клоўн». Маст. фільм.
**9.00** «Ну, пачакай!» М/ф.
**10.10** «Звычайны канцэрт».
**10.40** «Усім — дзякуй!» Маст. фільм.
**12.15, 1.30** «Ранішняе зззянне». Дак. фільм. 1-я серыя.
**13.05** «Лісты з правінцыі». Сургут.
**13.35** Дзяржаўны рускі народны хор імя М. Е. Пятніцкага.
**14.55** Легендарныя ролі Фрэда Астэра. «Каралеўскае вяселле». Маст. фільм.

**16.30** «Пешшу...» Масква гандлёвая.
**17.00** Па слядах тайны. «Калі на Зямлі кіравалі багі».
**17.45** «Музыка вады астравоў Вануату». Дак. фільм.
**18.35** «Рамантыка рамансa».
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Насця». Маст. фільм.
**21.40** Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра. Опера Руджэра Леанкавала «Паяцы» Зальцбургскага вялікодняга фестывалю. 2015 год. (18+).
**23.10** «Інспектар Гул». Маст. фільм.
**2.20** «Шпіёнскія страсці». «Жыў-быў сабака». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год. 1989. 2-я частка. 2010 год (12+).
**7.05, 8.25, 9.40, 13.20, 14.25, 15.40, 17.15, 18.55, 1.00, 2.25, 3.40, 5.00, 5.40** Музычная настальгія (12+).
**7.30, 1.25** Маст. фільм «Прафесія — следчы» (16+).
**8.35** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год (12+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**11.00** «Гэты фантастычны свет». 1979 год (12+).
**12.00** Маст. фільм «Падкідыш» (12+).
**13.40, 19.40** Дак. фільм «Двары нашага дзяцінства» (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** Маст. фільм «Не сышліся характарамі» (16+).
**18.00** «Акулы пяра». «Начныя клубы Масквы». 1995 год (18+).
**19.30** «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Прыватная ўласнасць (прыватызацыя)». 1992 год (12+).

**20.35** М/ф «У сінім моры, у белай пене» (12+).
**20.45** Фільм-канцэрт «Вас запрашае Сафія Ратару». 1985 год (12+).
**22.00** Маст. фільм «Пераклад з англійскай» (16+).
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока. Аляксей Хвасценка». 2006 год (16+).
**2.50** М/ф «Бюро знаходак» (0+).
**4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**5.30** Маст. фільм «Матылёк» (12+).

### EuroSport 1

**4.00, 14.00, 19.00, 21.00, 1.30** Веласпорт.
**6.30, 9.30, 16.00, 23.30** Алімпійскія гульні. «Зала славы».
**7.30, 10.30, 18.00, 23.00** Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
**8.00, 11.30, 20.00, 2.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**9.15** Watts.
**13.00** Аўтагонкі. Суперкубак Porsche.

### Кінакамедыя

**1.55** Ключ ад спальні. (12+).
**4.40** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**5.00** Замарожаны. (12+).
**6.35** Як снег на галаву. (16+).
**8.20** Прыгожыя дзяўчаты. (16+).
**10.30** Вясельны разгром. (18+).
**12.15** Паслявясельны разгром. (18+).
**14.00** Ягуар. (16+).
**16.00** Запалі гэтым летам. (16+).
**17.40** Хлапечнік па-ірландску. (16+).
**19.30** Прабач, хачу з табой ажаніцца. (12+).

**21.30** Замуж на два дні. (12+).
**23.35** Навіны з планеты Марс. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Паненка і кулінар» (12+).
**10.35, 1.55** «Сапраўдныя». Серыял (16+).
**14.10** «Жонка. Гісторыя кахання» (16+).
**15.35** «Акцёрскія драмы. Сысці ад спакусы». Дак. фільм (12+).
**16.30** «Труфельны сабака каралевы Джаваны». Серыял (12+).
**20.00** «Без падману» (16+).
**20.55** «Аўстралія». Драма (12+).
**23.50** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**0.20** «Грань». Серыял (16+).
**5.10** «Нераскрытыя тайны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 15.15** Скіўцы-2 (16+).
**8.30** Дывергент-2: інсургент (12+).
**10.55** Хуткі і мёртвы (16+).
**13.10** Калі свякроў — монстр (16+).
**17.30** Ла-Ла Лэнд (16+).
**20.10** Малавіта (16+).
**22.15** Дывергент-3: за сцяной (16+).
**0.35** Прыгажосць па-англійску (18+).
**2.40** Дзявяткі (16+).
**4.25** Ілгун, ілгун (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Дзень радыё (16+).
**8.30** Мафія: гульня на выжыванне (16+).
**10.30** Слон (12+).
**12.25** Хлопцы ў сусвеце (0+).
**14.10** Міфы (16+).

**16.10** Тэрмінова выйду замуж (16+).
**18.20** Герой нашага часу. (12+).
**20.20** Шчаслівы выпадак (16+).
**22.20** Пацыенты (16+).
**0.20** Заложнікі (18+).
**2.20** Мне не балюча (16+).
**4.20** Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).

### National Geographic

**6.00, 7.05** Аўта-SOS. (12+).
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.55, 10.10, 15.00** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.40, 12.30** Золата Юкана. (12+).
**9.25, 16.30** Дзікі тунец. (12+).
**11.45, 20.30, 0.35** Інстынкт выжывання. (16+).
**13.15, 18.50, 2.15** Феномены: узыходзячыя зоркі футбола. (16+).
**18.00, 22.05, 1.20** Егіпет: тайны мёртвых. (12+).
**22.55** Невядомая планета зямля. (12+).

### Discovery

**8.00** Як гэта ўстроена?
**11.00, 2.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі.
**12.00** Голыя і напалоханыя.
**13.00** Выжыць у цэнтры.
**14.00** Узрываючы гісторыю.
**15.00** Турбадуэт.
**16.00** Амерыканскі чоппер.
**17.00, 2.55** Тэхаскі метал.
**18.00, 21.30** Зброення з другаснай сыравіны.
**22.00** Разбуральнікі легенд.
**1.00** Навуковыя прыколы.
**3.50** Як працуюць машыны.
**4.40** Свяшчэнная сталь.
**7.10** Вулічная навука.

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*

НА ЎЛАСНЫЯ ВОЧЫ

# АСТРАВЕЦ: ЯК БУДУЕЦЦА ГОРАД ЭНЕРГЕТЫКАЎ

## Пуск першага энергаблока Беларускай АЭС плануецца на канец 2019 года

**ПАРЛАМЕНТАРЫІ наведалі горад атамшчыкаў і будаўнічую пляцоўку Беларускай АЭС. Удзельнікі выязнога пасяджэння на чале са старшынёй верхняй палаты парламента Міхаілам Мясніковічам ацанілі маштаб будаўніцтва самага маладога горада Беларусі і асабіста ўпэўніліся ў беспрэцэдэнтных мерах бяспекі пры ўзвядзенні атамнай станцыі. У Савеце Рэспублікі звярнулі ўвагу на забяспечанасць рабочымі месцамі тых, хто не працуе на атамнай станцыі, і рэкамендавалі мясцовым уладам вырашыць пытанні па арганізацыі быту і вольнага часу жыхароў раёна, а таксама па забеспячэнні бяспекі і здаровага ладу жыцця.**

### ВУЧЭБНЫ ЦЭНТР І ЧАТЫРЫ СТУПЕНІ АБАРОНЫ

Астравец, дзе будуецца Беларуская АЭС, стаў другім, пасля Ашмян, пунктам маршруту выязнога пасяджэння Савета Рэспублікі, на якім разглядалася тэма фарміравання эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі. Бясспрэчна, атамная станцыя — гэта аб'ект, які будзе садзейнічаць устойліваму эканамічнаму росту не толькі рэгіёна, але і ўсёй краіны. Беларусь атрымае больш танную электраэнергію.

Як растлумачылі спецыялісты, сабекошт электрычнай энергіі на атамнай станцыі будзе 3,27 цэнта, зараз гэты паказчык у энергасістэме складае 4,5 цэнта. Да 2025 года станцыя выйдзе на поўную магутнасць.

Пуск першага энергаблока плануецца на канец будучага года. У сакавіку 2019-га адбудзецца фізічны пуск — пачнецца загрузка ядзернага паліва. А праз месяц станцыя павінна «ўліцца» ў агульную энергасістэму. Кошт праекта складае 7 млрд долараў. Ужо асвоена больш за палову. Усе асноўныя будаўнічыя работы па станцыі завершаны. Набраны персанал па абслугоўванні важнага стратэгічнага аб'екта. Усяго будзе працаваць пяць змен. Больш за 50 спецыялістаў прайшлі стажыроўку на дзеючых станцыях за мяжой і зараз адпрацоўваюць алгарытм дзеянняў у вучэбным цэнтры Беларускай АЭС. Трэнажорны зал адлюстроўвае ўвесь працэс работы станцыі ў аўтаматычным рэжыме. Улічваецца і псіхалагічная сумяшчальнасць персаналу — усе яны прайшлі адпаведны тэст.

Удзельнікі семінара даведаліся аб мерах бяспекі будучай станцыі. У інфармацыйным цэнтры расказалі аб чатырох бар'ерах, якія не дапусцяць, каб радыяцыя трапіла ў навакольнае асяроддзе. Напрыклад, на Чарнобыльскай АЭС было толькі два такія бар'еры.

### САЦЫЯЛЬНЫ АКЦЭНТ АСТРАЎЦА

Будаўніцтва станцыі амаль што супала з набыццём Астраўцом статусу горада. У ім цяпер пражывае каля 11 тысяч чалавек, чакаецца, што да 2025 года гэта лічба падвоіцца. Адпаведна расце і сацыяльная інфраструктура, на гэтыя мэты летась выдаткавана 60 млн рублёў па Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме. Пабудаваны шматпавярховыя дамы, інжынерныя сеткі, дарогі, дзіцячы садок на 190 месцаў. Напрыканцы чэрвеня здаюцца яшчэ адзін дзіцячы садок і школа на 700 месцаў.

У Савеце Рэспублікі звярнулі ўвагу на неабходнасць забяспечыць работай тых, хто не з'яўляецца работнікам АЭС.

— У Астраўцы мы асобую ўвагу ўдзяляем вырашэнню сацыяльных праблем, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч, — на АЭС прыедзе працаваць даволі шмат спецыялістаў. Трэба вырашаць праблемы працаўладкавання членаў іх сем'яў, пытанні дашкольных і школьных устаноў, медыцынскага абслугоўвання, увогуле комплекснага развіцця рэгіёна. Разам з выканаўчай уладай гэтую работу павінны весці і мясцовыя Саветы.

Парламентарыі змаглі ацаніць комплекснае развіццё населенага пункта ў сацыяльным аспекце. Горадператварыўся ў агульную шматпавярховую забудову. Праблему жылля тут вырашаюць у першую чаргу. Толькі сёлета будзе здадзена ў эксплуатацыю 30 тыс. кв. м жылля, для работнікаў сацыяльнай сферы плануецца перапрафіляваць некалькі будынкаў у райцэнтры. Згодна з рашэннем Савета Рэспублікі, варта звярнуць увагу на будаўніцтва арэнднага жылля для спецыялістаў, якія прыедуць працаваць у Астравецкі раён.

Была звернута ўвага і на неабходнасць арганізацыі быту і вольнага часу жыхароў раёна, здаровага ладу жыцця. Трэба сказаць, што планаў у гэтым кірунку ў мясцовых уладаў нямала. Адчыніць свае дзверы буйны фізкультурна-аздараўленчы комплекс з басейнам, у рамках інвестпраграмы ў лесапаркавай зоне будуецца гарадскі стадыён на адну тысячу месцаў.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У 2-м мікрараёне ўзводзяцца карпусы бальніцы, якую плануецца здаць налета. Камплектацыя вядзецца з улікам новых тэхналогій. У перспектыве большасць аддзяленняў стане не толькі міжраённымі, але і міжрэгіянальнымі. Напрыклад, аддзяленнем кардыялогіі з самым сучасным абсталяваннем змогуць карыстацца жыхары суседніх раёнаў. А ў старым будынку бальніцы размесціцца паліклініка.

### ЯКАЯ БУДУЧЫНЯ Ў ГОРАДА АТАМШЧЫКАЎ?

Сёння горад атамшчыкаў вядомы далёка за межамі краіны. Будоўля стагоддзя не зніжае тэмпаў. На вачах расце новы сучасны горад. Толькі на ўзвядзенні станцыі працуе пяць тысяч будаўнікоў. Першая Беларуская АЭС прыцягвае і звычайных грамадзян. Дарэчы, атрымаць адказы на ўсе пытанні, якія датычацца станцыі, можна ў інфармацыйным цэнтры, створаным разам з пачаткам будаўніцтва АЭС. За гэты час тут пабывала больш за 15 тысяч наведвальнікаў. Шырокую асветніцкую работу супрацоўнікі цэнтра праводзяць з вучнямі і педагогамі. Дарэчы, з уводам новых сацыяльных аб'ектаў у горадзе спатрэбяцца і адпаведныя спецыялісты — урачы, медсёстры, педагогі, выхавальнікі. Толькі ў новую бальніцу спатрэбіцца 400 работнікаў, яшчэ 50 — у фізкультурна-аздараўленчы комплекс.

Астравец упэўнена рухаецца па шляху ўстойлівага развіцця эканомікі. Аб гэтым сведчыць і спрыяльны інвестыцыйны клімат: у горад прыйшлі вядомыя гандлёвыя сеткі, у тым ліку з замежным капіталам. Савет Рэспублікі парэкамендаваў узяць пад асобы кантроль фарміраванне цэн у гандлёвых арганізацыях горада і забеспячэнне жыхароў раёна спажывецкімі таварамі і паслугамі.

У горада нямала планаў. Многія з іх звязаны з дзецьмі і моладдзю. Нядаўна ў 2-м мікрараёне каля прыгожай алеі пачалося будаўніцтва Дома дзіцячай творчасці, які будзе здадзены налета. Яшчэ адзін шматфункцыянальны комплекс сацыяльна-культурнага прызначэння і творчасці моладзі плануецца будавацца на беразе возера і адчыніць свае дзверы ў 2020 годзе.

Для шматдзетных сем'яў і дзяцей-сірот будзе пабудавана два шматпавярховыя дамы. У 3-м мікрараёне вядзецца праектаванне раёна сядзібнай забудовы на 340 участкаў, у тым ліку будаўніцтва камерцыйнага жылля.

У далейшых планах — будаўніцтва новага аўтавакзала на праспекце Энергетыкаў. Мадэрнізацыя закране кінаканцэртную залу «Астравец» — далучыцца яшчэ адно памяшканне, зменіцца сцэна, залы, музычнае абсталяванне.

Не забудуць і пра паркі. У раёне пешай рэкрэацыйнай зоны з'явяцца новыя месцы адпачынку, заняткаў спортам з пешымі сцежкамі і веладарожкамі. Запланаваны яшчэ адзін, трэці па ліку, спартыўны аб'ект — крытая лядовая пляцоўка. Вядзецца добраўпарадкаванне тэрыторыі атамнай станцыі. Пры гэтым тут сочаць за тым, каб усе работы выконваліся па графіку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Мой родны КУТ...

## Адмысловы праект з удзелам вясковых старастаў рэалізавалі на Ашмяншчыне



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**КУТ — гэта клубы вясковых старастаў, што дзейнічаюць у аграгарадках Кальчуны і Мураваная Ашмянка.**

Іх удзельнікі — актыўныя вяскоўцы, старасты вёсак і мясцовыя жыхары Кальчунскага і Мураванаашмянкаўскага сельскіх Саветаў, сярод якіх вясковыя бібліятэкары, школьнікі і моладзь, прадстаўнікі органаў улады ды іншыя.

Стварэнне клубаў вясковых старастаў стала дыялогавай пляцоўкай для ўзаемадзеяння грамадзян і органаў улады ў вырашэнні праблем мясцовага маштабу, растлумачылі яго ініцыятары. З дапамогай КУТа ствараюцца сацыяльна-інфармацыйныя цэнтры на базе мясцовых бібліятэк, арганізуюцца валанцёрскія групы для дастаўкі літаратуры і аказання сацыяльна-бытавых паслуг састарэлым жыхарам аддаленых населеных пунктаў.

Акрамя гэтага, дзякуючы розным конкурсам, такім як «Добрая справа», «Найлепшы гаспадар», дзіцячай творчасці «Замалёўкі з вандроўкі» і «Мой родны кут», вяскоўцы далучаюцца да рэалізацыі значных спраў у сваім рэгіёне. А яшчэ праект паспрыяў арганізацыі свят народнай культуры «Земляки» і «КУТарскі фэст».

Як паведамілі ў райвыканкаме, праекты ініцыятыўнай групы грамадзян Кальчунскага і Мураванаашмянкаўскага сельскіх Саветаў і мясцовай улады рэалізавалі дзякуючы перамозе ў конкурсе «ТАНДЭМ», што прайшоў у межах міжнароднай гуманітарнай дапамогі. Мэта праектаў — прыцягнуць грамадзян да вырашэння пытанняў мясцовага значэння.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**



# І ЗАХАВАЦЬ, І ЗАРАБІЦЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.*
*«МС».)*

Перш за ўсё гэта датычыцца лясных заказнікаў, а такіх каля 80 %. У многіх з іх зусім няма абмежаванняў па высечцы. Гэта, напрыклад, мясцовыя заказнікі «Бабравіна» і «Белута», «Алес», рэспубліканскі заказнік «Пойма ракі Сож» і шмат іншых. Там вядзецца звычайная лясная гаспадарка з усімі наступствамі. Фактычна гэтыя заказнікі высякаюцца пад нуль. Пералічаныя прыклады — з Брэсцкай і Гомельскай абласцей. Самі лясгасы здзіўляюцца: навошта ствараць такія заказнікі?


Фота Андрэя АБРАМЧУКА.

**Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Выдрыца» (Жлобінскі і Светлагорскі раёны). Праект новага закона забараняе такія знішчальныя высечкі ў заказніках.**

Цяпер для ўсіх заказнікаў прапісаны абмежаванні па самых шкодных высечках, якія цалкам знішчаюць экасістэмы (суцэльныя галоўнага карыстання і палосна-паступовыя). Гэта адно з самых галоўных новаўвядзенняў.

Яшчэ адно важнае новаўвядзенне датычыцца асабліва ахоўных прыродных тэрыторый міжнароднага значэння. У пералік такіх уключылі аб'екты «Ізумруднай сеткі», да якой у 2013 годзе далучылася Беларусь, але з адным удакладненнем: адносіцца гэта толькі да тых аб'ектаў, якія маюць нацыянальны прыродаахоўны статус. Тыя ж, якія такога статусу не маюць, не ўвойдуць і ў пералік асабліва ахоўных тэрыторый міжнароднага значэння. Такім чынам распрацоўшчыкі зрабілі палову кроку. З аднаго боку, мы прызнаём міжнародныя дакументы, у прыватнасці — Бернскую канвенцыю, з другога — будзем выконваць іх настолькі, наколькі гэта дазваляе наша заканадаўства. Тым не менш ужо добра, што аб'екты «Ізумруднай сеткі» згаданы ў праекце закона. Зараз у нас 162 такія аб'екты, або 11,57 % тэрыторыі краіны.

Трэці значны момант — праект закона прадугледжвае ўдзел грамадскасці ў шэрагу важных прыродаахоўных мерапрыемстваў. Напрыклад, у фарміраванні і рабоце вучоных саветаў нацыянальных паркаў, у праведзенні грамадскіх абмеркаванняў схем развіцця асабліва ахоўных прыродных тэрыторый — як рэспубліканскага, так і мясцовага значэння. Схемы гэтыя зацвярджаюцца на дзяржаўным узроўні, і часта грамадскія арганізацыі добра ведаюць тую альбо іншую тэрыторыю, якой мэтазгодна надаць статус асабліва ахоўнай.

Насамрэч змен не так шмат, як хацелася б. Мы прапаноўвалі значна больш, але, на жаль, прыкладна толькі траціна з нашых прапаноў увайшла ў праект.

Увогуле, лічыцца, што прырода ў Беларусі захавалася значна лепш, чым у астатняй Еўропе. Пры гэтым у нас адзін з самых нізкіх у Еўропе паказчыкаў плошчы асабліва ахоўных прыродных тэрыторый у працэнтных адносінах. У кожнай краіне існуе свая схема такіх тэрыторый, і не заўсёды іх можна параўноўваць. Але можна параўнаць па сетцы «Натура 2000», якая ствараецца ў краінах ЕС, і сеткі «Эмеральд» («Ізумрудная сетка»), створанай у еўрапейскіх краінах, якія не ўваходзяць у Еўрапейскі саюз. Гэтыя дзве экалагічныя сеткі абсалютна адпаведныя па сваіх прынцыпах і крытэрыях. Па долі сеткі «Эмеральд» Беларусь у аўтсайдарах — 11,57 % ад усёй плошчы — трошкі вышэй за Англію і Данію, дзе засталіся рэшткі прыроды. Але сярэднееўрапейскі паказчык — 17 %. Для мяне гэта дзіўна.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяны КАНАНЧУК:**

— Асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі і сетка «Эмеральд» — не зусім аднолькавыя рэчы. Доля асабліва ахоўных прыродных тэрыторый у Беларусі складае 8,7 % ад плошчы краіны, да гэтага дадайце «Ізумрудную сетку». Да 2020 года плануецца павялічыць долю асабліва ахоўных прыродных тэрыторый да 8,8 %. Дасягнуць гэтага будзе лёгка, бо не абавязкова спатрэбіцца стварэнне новых, у нас увесь час ідзе працэс пераўтварэнне тых, што маюцца. Гэта нармальны паказчык. Аб тым, наколькі добра краіна працуе ў гэтым плане, сведчыць дынаміка: у 2015 годзе доля асабліва ахоўных прыродных тэрыторый складала 8,2 %.

Міжнародная супольнасць ацэньвае беларускі паказчык як вельмі добры. Сапраўды, гэтыя рэчы нельга параўноўваць, бо ў кожнай краіне свае падыходы і свае крытэрыі. Напрыклад, калі доля асабліва ахоўных прыродных тэрыторый у Германіі 28 %, то пад строгім рэжымам аховы знаходзіцца толькі 3 %. На астатняй тэрыторыі можна весці тую альбо іншую дзейнасць. Немэтазгодна ахоўваць дзясяткі тысяч гектараў зямлі там, дзе можна праводзіць гаспадарчую дзейнасць пры ўмове захавання экасістэмы. Мы сёння асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі, заказнікі павінны разглядаць з улікам сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, развіваць інфраструктуру турызму, прасоўваць экалагічны турызм.

ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЙШОЎ

# НАВЯДЗЕННЮ ПАРАДКУ — АСАБЛІВАЯ ЎВАГА

**На Міншчыне, як і паўсюдна, падчас апошніх выбараў быў абноўлены склад мясцовых Саветаў дэпутатаў. Сюды прыйшло нямала творчых, ініцыятыўных людзей, якія імкнуцца зрабіць жыццё больш камфортным, зручным, вырашыць надзённыя праблемы сваіх рэгіёнаў. Некаторыя з «навічкоў» — старшынь Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню, — падзяліліся сваімі планамі, ідэямі, прапановамі з «МС».**

## Аляксандр ПРАНОВІЧ, старшыня Пухавіцкага раённага Савета дэпутатаў:

— Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне Пухавіцкага раёна прадстаўлена 13 сельскімі і Праўдзінскім пасялковым выканкамамі. З сакавіка 2018 года да работы прыступілі пяць новых старшынь пасялковага і сельскіх выканкамаў. Яны маюць дастатковы вопыт і добра ведаюць праблемы сваіх рэгіёнаў.

Адна з іх, зрэшты, як і ў іншых раёнах Мінскай вобласці, — утрыманне і добраўпарадкаванне грамадзянскіх могілак. У веданні выканкамаў іх — 110. Так пастаянна праводзяцца работы па ўстаноўцы і рамонце агароджаў, вывазе адходаў, выдаленні аварыйных дрэваў і зараснікаў — у межах фінансавання, якое ёсць.

У адпаведнасці з заканадаўчай базай аб пахаванні і пахавальнай справе, неабходна правесці інвентарызацыю могілак і поўны дзяржаўны ўлік участкаў пахаванняў. Ды і ўтрыманню тэрыторый і добраўпарадкаванню могілак трэба ўдзяляць больш увагі. Лічу, што гэтымі пытаннямі павінны ўсё ж займацца спецыялізаваныя арганізацыі, якія маюць неабходную тэхніку і рабочую сілу. На маю думку, гэта найбольш рацыянальнае рашэнне праблемы.

## Сяргей ШЭСТАЛЬ, старшыня Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў:

— Уся мая працоўная дзейнасць звязана са Стаўбцоўшчынай. Апошнія дванаццаць гадоў працаваў намеснікам старшыні райвыканкама, курыраваў сацыяльную сферу... Балатаваўся па Дзераўнянскай выбарчай акрузе. Перш за ўсё людзі тут заклапочаны станам вулічнай і дарожнай сеткі, якая знаходзіцца ў аграгарадку Дзераўная на ўтрыманні сельгасарганізацый, і патрабуюць рамонту. Цяпер ідзе інвентарызацыя ўсёй дарожна-вулічнай сеткі. На ўзроўні вобласці будзе прынятае рашэнне: на чый баланс іх перадаць. У найбліжэйшы час, мяркую, навядзём тут парадак.

У Год малой радзімы разам са старшынямі сельскіх Саветаў дэпутатаў займаемся навядзеннем парадку на зямлі, зносам старых і пустуючых дамоў — да канца года прыбяром 27 будынкаў. Новы сфарміраваны рэгістр уключае 49 дамоў, якія ідуць пад знос. Уласнікаў, якія не падтрымліваюць парадак, папярэдзілі, і па рашэнні суда займаемся зносам. Праблема ўзнікае па старых дамах. Адпаведна з дзеючым заканадаўствам, сельвыканкам павінен выкупіць іх ва ўласніка, а затым патраціць грошы на знос з бюджэту пярвічнага ўзроўню. Атрымліваецца, неабходна двойчы несці затраты з-за дрэннага гаспадара.

Наспеў час уносіць змяненні ў заканадаўства. Напрыклад, вызначыць часовы перыяд, няхай сабе тры гады. І калі за гэты час уласнік не прыняў мер па навядзенні парадку, то дом аўтаматычна пераходзіў бы ва ўласнасць дзяржавы, і мы мелі б права яго знесці.

## Андрэй ПАЎКШТА, старшыня Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў:

— Раней працаваў дырэктарам камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Маладзечнаводаканал». Прайшло не так шмат часу на новай пасадзе, таму хваліцца поспехамі рана. Пачаў з вывучэння заканадаўства, якое датычыцца дзейнасці, функцый, паўнамоцтваў Саветаў. Цяпер унікаю ў сутнасць дакументаў больш скрупулёзна, падрабязна.

Шмат увагі ўдзяляем навядзенню парадку на зямлі, добраўпарадкаванню, зносу старых дамоў, санітарнаму стану аб'ектаў і тэрыторый, вясковых могілак, якіх налічваецца 53, яны знаходзяцца на балансе сельвыканкамаў. Ужо больш як у 70 % месцаў пахаванняў правялі інвентарызацыю — па кожных могілках зроблены фотаздымкі з квадракоптара. У найбліжэйшы час работы скончацца і па астатніх.

Маштабна працуем па выкараненні баршчэўніка Сасноўскага — з выкарыстаннем хімічнай, механічнай апрацоўкі. На гэта выдзелена 10 тысяч рублёў з раённага бюджэту, таксама сродкі з бюджэтаў сельвыканкамаў, прызначаныя на добраўпарадкаванне.

Кантралюем мы і работу па ўтрыманні ў добрым стане дарог. Але тут праблемы ствараюць дачнікі. Яны не выкідваюць смецце ў кантэйнеры, што змешчаны ў садовых таварыствах, а імкнуцца пазбавіцца ад яго па дарозе ў горад, пакідаюць яго на аўтобусных прыпынках, абочынах дарог. Толькі дарожныя службы навядуць парадак, а на наступны дзень зноў тое ж самае. Хацелася б, каб грамадзяне былі больш сумленныя і адказныя.

## Юлія БЯЛЯНКІНА, старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў:

— Мінскі раён — адзін з самых вялікіх раёнаў Мінскай вобласці, тут зарэгістравана больш як 225 тысяч чалавек.

У наступным годзе ў краіне пройдуць II Еўрапейскія гульні. З улікам таго, што ўсе дарогі ў сталіцу вядуць цераз прысталічны рэгіён, асаблівая ўвага ўдзяляецца добраўпарадкаванню і навядзенню парадку на зямлі, азеляненню населеных пунктаў. Старшынямі Заслаўскага гарадскога, Мачулішчанскага пасялковага і сельскіх выканкамаў распрацаваны планы па добраўпарадкаванні на 2018—2019 гады, якія паспяхова абаронены на пачатку гэтага года.

Вырашаецца пытанне перадачы аўтамабільных дарог на баланс спецыялізаваных арганізацый. Яшчэ адно набалелае — уладкаванне інжынернай і транспартнай структур жыллёвых кааператываў індывідуальнай забудовы. Зямельныя ўчасткі там былі выдзелены грамадзянам, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. І самае праблемнае тут — адсутнасць пад'язных шляхоў і дарог да дамоў.

У сувязі са значным ростам і развіццём раёна (толькі ў Бараўлянскім сельсавеце налічваецца больш як 55 тысяч чалавек, у Сеніцкім — больш як 20 тысяч) сутыкнуліся з недахопам месцаў у дашкольных і школьных установах. Ужо рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя для будаўніцтва трох дзіцячых садкоў і адной школы ў Мінскім раёне. На парадку дня — паляпшэнне даступнасці і якасці аказання медыцынскіх паслуг. Так, у 2018 годзе плануюцца адкрыццё тэрапеўтычнага корпуса ў Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы на 180 і месцаў, рамонт Астрашыцка-гарадоцкай амбулаторыі. У недалёкіх планах — узвядзенне Хацежынскай амбулаторыі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# УБАЧЫЦЬ ВЁСКУ... ЗА КУСТАМІ,

## або Некаторыя асаблівасці практыкі выдалення расліннасці

**Аб праблемах, якія ўзнікаюць падчас навядзення парадку на зямлі, «МС» расказвае сваім чытачам рэгулярна. Сёння, у прыватнасці, засяродзім увагу на зрэзцы драўнінна-хмызняковай расліннасці.**



### Калі насамрэч перашкаджае...

На першы погляд, здавалася б, што можа быць прасцей, калі гэта трэба для добраўпарадкавання? Тым больш у Год малой радзімы?

Але **старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў Віктар ДАРОЖКІН** мае свой пункт гледжання.

— Каб зрэзаць непрыгожыя дрэвы і кусты — у выпадках, калі вышыня і першых, і другіх перавышае 130 сантыметраў, — трэба патраціць шмат часу на бюракратычную валакіту: запоўніць адпаведны дакумент накont запланаваный зрэзкі, зрабіць фота, скласці карту з выявай, адправіць гэта ў прыродаахоўнае ведамства, потым атрымаць дазвол...

> Наспеў час абмеркавання гэтага пытання і ўнясення адпаведных змяненняў накont зрэзкі раслін па заяўным прынцыпе ў заканадаўчую базу.

Кіраўнік райсавета расказаў і пра асаблівасці нацыянальнай практыкі выдалення драўнінна-хмызняковай расліннасці на прыдарожных тэрыторыях і землях сельскагаспадарчага прызначэння. За добраўпарадкаванне першых, адпаведна, адказваюць дарожнікі, другіх — сельскагаспадарчыя арганізацыі. Напрыклад, на полі расце дрэва, з-за якога сельскагаспадарчай тэхніцы даводзіцца манеўраваць, каб яго не зачапіць. Для зрэзкі такога дрэва пад корань, неабходна шмат узгадненняў. Дарэчы, у Віцебскім раёне быў сумны выпадак, калі нявопытны кіраўнік гаспадаркі, не ведаючы, што трэба аформіць адпаведныя паперы, аддаў уласнае распараджэнне. Гаспадарцы прыйшлося потым выплаціць штраф, патраціцца на кампенсацыйныя выплаты.

### Сутыкненне інтарэсаў?

У нашай краіне, як і ў іншых, дзейнічаюць законы, якія былі прынятыя, каб абараніць навакольнае асяроддзе. У гэтым выпадку прымяняецца Закон «Аб раслінным свеце» (ад 14 чэрвеня 2003 года). Плюс мясцовыя ўлады павінны выконваць адпаведныя пункты пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 кастрычніка 2011 года № 1426. У апошняй ёсць палажэнне, якое рэгулюе ўмовы кампенсацыйных пасадак або кампенсацыйных выплат, калі кустоўе ці дрэва трэба зрэзаць. Сярод іншага там ёсць фармулёўкі, разабрацца ў якіх даволі цяжка. Пры гэтым трэба яшчэ і добра ведаць пароды і віды дрэў і кустоўя, паколькі ў адпаведным дадатку мае месца іх пералік. Разам з тым, неабходна яшчэ і даказаць, што вербы, алешына, бярозы і іншыя насамрэч не павінны расці на тым ці іншым кавалку зямлі. Па рашэнні райвыканкама робіцца пісьмовы запыт ва ўпаўнаважаную арганізацыю (у залежнасці ад месца вырастання). Заява разглядаецца на працягу трох каляндарных дзён. Потым выдаецца заключэнне ў дачыненні да аб'екта расліннага свету. Мясцовы выканаўчы орган арганізуе абмеркаванне з грамадскасцю. Трэба, каб людзі на сходзе большасцю галасоў пацвердзілі, што расліны аварыйныя, перашкаджаюць доступу да інжынерных камунікацый, добрай асветленасці...

На погляд старшыні Віцебскага райсавета, у гэтым пытанні заканадаўства адстае ад патрэб часу.

— Канешне, у Год малой радзімы вялікая ўвага ўдзяляецца і навядзенню парадку на зямлі. Але калі сутыкнуўся з рэаліямі — а я ўпершыню выбраны на пасаду — упэўніўся, што ёсць праблема, — развае сур азмоўнік. — У прыватнасці, не адзін тыдзень займае працэс афіцыйнага замацавання за сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі зямельных участкаў. А без такога дакумента фактычна нельга выдаліць нават кустоўе.

На думку Віктара Дарожкіна, не вельмі зацікаўлены ў добраўпарадкаванні прыдарожных палос самі дарожныя арганізацыі. Тым больш што паводле іх нарматываў, гэта трэба рабіць у выпадках, калі расліны і дрэвы перашкаджаюць бачыць знакі ды іншыя аб'екты на дарогах. Але ж гэта, калі задумацца, вельмі суб'ектыўнае стаўленне. Аднаму кіроўцу, можа, нешта і перашкаджае, другі — наадварот добра ўсё бачыць.

> Кіраўнік прадстаўнічай улады ўпэўнены, што ў пытанні добраўпарадкавання і, у прыватнасці, зрэзкі раслін трэба больш паўнамоцтваў даваць на месцах.

— Мясцовыя органы ўлады ў першую чаргу зацікаўленыя ў тым, каб паўсюдна, у тым ліку і па баках дарог, быў ідэальны парадак. Бачым, што дарогі зараслі кустоўем, якое трэба выдаляць, але вось няўдача — вадзіцелям яно не перашкаджае! Таму ўзнікае яўная супярэчнасць, — прац ягвае Віктар Дарожкін.

### Погляд з дарогі

Старшыня запрасіў разам праехацца па дарогах, паказаў кустоўі і дрэвы, якія насамрэч (нават няўзброеным вокам відаць) трэба было даўно зрэзаць пад корань. Запытаў, ці бачу я, што за дрэвамі і кустоўем знаходзіцца вёска?.. Але каб убачыць яе, трэба было добра прыглядзецца... Відавочна, што, калі спрасціць заканадаўства, можна літаральна «адкрыць» такія вёскі. Ёсць прыклад, калі ў выніку добраўпарадкавання адной з іх, дамы актыўна пачалі купляць дачнікі.

**Старшыня Суражскага сельвыканкама Аляксандр ВЯЛІТЧАНКА** сказаў, што адна з вёсак раней лічылася знікаючай. Пасля таго як яе добраўпарадкавалі, атрымала новае жыццё. І цяпер там падчас дачнага сезона ў набытых дамах жывуць каля дваццаці сямей. Кіраўнік прадстаўнічай улады ўпэўнены, што ў пытанні добраўпарадкавання і, у прыватнасці, зрэзкі раслін трэба больш паўнамоцтваў даваць на месцах.

> Сярод іншага там ёсць фармулёўкі, разабрацца ў якіх даволі цяжка. Пры гэтым трэба яшчэ і добра ведаць пароды і віды дрэў і кустоўя, паколькі ў адпаведным дадатку мае месца іх пералік.

— Мы ж лепш тут ведаем: што неабходна выдаліць, а што павінна расці. Чаму трэба хадзіць па кабінетах, каб прыбраць нешта хоць бы ў населеных пунктах? І чаму дырэктар гаспадаркі не можа на месцы вырашыць гэтае пытанне? Усе работы ў населеным пункце — пракладка камунікацый, рыццё катлаванаў, іншае — робіцца з дазволу сельскага выканкама. Чаму тады нельга зрабіць аналагічнае і ў пытанні зрэзкі кустоў? Наспеў час абмеркавання гэтага пытання і ўнясення адпаведных змяненняў накont зрэзкі раслін па заяўным прынцыпе ў заканадаўчую базу, — падзяляецца думкамі Аляксандр Вялітчанка.

Выказаў ён і такія аргументы. Напрыклад, чалавек хоча нарыхтаваць сабе дровы. Дзеля гэтага неабходна патраціць час на атрыманне дазволу. І ў лепшым выпадку яму дазволяць зрабіць нарыхтоўку на адлегласці некалькі кіламетраў ад дома.

— А ў ідэале можна было б нарыхтоўваць дровы самім, — дадаў старшыня, — з таго, што расце побач і не ўяўляе вялікай каштоўнасці з пункту гледжання экалогіі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении аукциона | | |
|---|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 | |
| Продавец | Частное предприятие «БуйМоторс», ул. Стариновская, 9/3, аг. Колодищи, 223050, Минский р-н | |
| Предмет аукциона | | |
| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
| **Производственное здание «Склад готовой продукции № 2»** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 2437,2 кв. м | 200/С-63838 |
| **Составные части и принадлежности:** подвал, четыре пристройки, четыре рампы, проезжая часть (участки 1, 2, 3), телефонный кабель, проезжая часть, ограждение | | |
| **Адрес:** Витебская обл., г. Витебск, ул. Академика Павлова, 44А | | |
| Начальная цена с НДС 20 % | **80 000,00 белорусского рубля** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | **10** рабочих дней после проведения аукциона | |
| Условия оплаты предмета аукциона | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | |
| Дата и время проведения аукциона | **26.07.2018** в 11.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| Дата и время окончания приема документов | **24.07.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| Контактные телефоны | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** | |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении аукциона | | |
|---|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 | |
| Продавец | ООО «Кеакан», 220125, г. Минск, пр-т Независимости, 185, пом. 7 | |
| Предмет аукциона | | |
| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Помещение неустановленного назначения** | 227,4 кв. м | 500/D-690215 |
| **Адрес:** г. Минск, ул. Краснозвездная, д. 9, пом.1Н | | |
| Начальная цена с НДС 20 % | **136 440,00 доллара США** (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона) | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001. Нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | **10** рабочих дней после проведения аукциона | |
| Условия оплаты предмета аукциона | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | |
| Дата и время проведения аукциона | **26.07.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| Дата и время окончания приема документов | **24.07.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| Контактные телефоны | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** | |

Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» сообщает, что **10 июля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1** состоится **повторный аукцион** по продаже земельного участка **У-165 микрорайон «Барановичи-5, 6»** для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома с кадастровым номером **440100000003005316** площадью **0,0994 га.**
Начальная цена продажи: **11 752,69 рубля,** сумма задатка – **2 200 рубля.**
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 — 17.00 **по 4 июля 2018 года.**
Телефоны для справок в Гродно: (0152) 742095, 720537, 720546.
Адрес сайта: www.grodno.gov.by
УНП 590727594

Свидетельство о государственной регистрации ООО «Аист-импорт», УНП 192303592, считать недействительным в связи с утратой

А НЕ ШКОДЗЬ!

## Без дакументаў — нельга

**Кіраўнік паляўнічай гаспадаркі быў затрыманы па падазрэнні ў незаконным паляванні.**

Крымінальную справу па факце незаконнай здабычы дзікоў распачаў Чэрвеньскі РАСК у дачыненні да кіраўніка мясцовай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў і жыхара Чэрвеньскага раёна, які паляваў з ім. Паляўнічых затрымалі ноччу супрацоўнікі Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету. У багажніку аўтамабіля мужчыны перавозілі тушы трох самак дзіка: на здабычу адной асобіны дазвол меўся, але не былі пагашаны ўсе талоны на перавозку, на дзвюх астатніх дакументаў не было.

Здабыча дзіка, у сувязі з прафілактыкай афрыканскай чумы, вядзецца ў асаблівым рэжыме (цэлы год, без абмежаванняў па колькасці, поле і ўзросце), аднак з афармленнем усіх неабходных дакументаў, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Іх адсутнасць і стала падставай для разбору, бо не ведаць пра парадак выдачы пуцёвак і дазволаў пры паляванні на дзіка дырэктар паляўнічай гаспадаркі не мог.

Часта ў падобных выпадках паляўнічыя проста хочуць схітраваць і забраць мяса здабытых дзікоў, хоць іх тушы па законе павінны падлягаць утылізацыі, а гаспадарка і паляўнічыя — наўзамен атрымліваюць грашовую кампенсацыю.

Пра тое, што гэта справа можа аказацца вярхушкай айсберга, сведчыць і той факт, што па дакументах у паляўнічай гаспадарцы з пачатку года здабыта толькі 13 дзікоў, у той час як на практыцы за адну ноч — адразу тры.

Затрыманыя былі змешчаны ў ізалятар. У абодвух канфіскавалі зброю і перадалі ва ўпраўленне Дзяржкамітэта судовых экспертыз па Мінскай вобласці для правядзення балістычнай экспертызы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

УНЁСАК У МАСТАЦТВА

# АНШЛАГ, І ЗНОЎ АНШЛАГ!

## Краснапольскія дэпутаты падтрымалі «народнікаў»

**НЕКАЛЬКІ дзён таму краснапольскі народны тэатр адзначыў сваё стагоддзе. На фестываль «Тэатральныя вечарыны», які праходзіў тут сёмы раз, прыехала шмат удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы. Далучыўся нават калектыў з літоўскага горада Рокішкіс, які прымаў удзел яшчэ ў першым фестывалі. Тры дні на сцэне мясцовага цэнтра культуры ішлі пастаноўкі аматарскіх калектываў з Магілёва, Мінска, Гатчыны, Чарнігава, Екацярынбурга. Вярнуцца на міжнародны ўзровень краснапольскаму тэатру дапамаглі ў тым ліку і народныя абраннікі. І шмат сіл у гэтую справу ўклала Алена РАМАНЕНКА, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Краснапольскага райвыканкама, дэпутат папярэдняга склікання.**

### А памятаеш, як усё пачыналася?

Напэўна, Краснапольшчына — спрыяльная зямля для творчых людзей. Адсюль родам легенда савецкай эстрады Марыя Пахоменка, ваенны паэт Аляксей Пысін. Як ён трапна сказаў пра свой край у вершаваных радках — «салаўіны, глыбінны раён». У Краснаполлі наогул цяжка знайсці чалавека, абыякава-



Валянцін Ермаловіч убачыў у ёй Паўлінку (Святлана дэманструе фестывальную ўзнагароду).

га да тэатра. Напрыклад, **старшы інспектар аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Святлана Петрачэнка** на сцэне з 19 гадоў. І лічыць знамянальным, што ее пяцідзесяцігадовы юбілей супаў з тэатральным стагадовым. З дзяцінства марыла пра сцэну і трапіла на яе дзякуючы таленавітаму і апантанаму акцёру і рэжысёру Валянціну Ермаловічу, які ўзначаліў тэатр у канцы 80-х.

Першы фестываль, арганізаваны Валянцінам Ермаловічам, прайшоў у Краснаполлі ў 1993 годзе. Пасля быў яшчэ адзін з удзелам творчых калектываў Літвы і Латвіі, а потым справа заглухла.

— Я прыйшла сюды на работу ў 2009 годзе, і першае жаданне было — падтрымаць наш тэатр, папулярызаваць народную творчасць, у першую чаргу Краснапольшчыны, — успамінае Алена Раманенка. — Першае, з чаго мы пачалі, арганізавалі ў 2012 годзе тэатральны тыдзень. Прайшоў ён вельмі сціпла, але ж мы нагадалі, што існуём. У 2013 годзе Анатоль Сінкавец, на той час начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама, убачыў нашы творчыя пачынанні і падтрымаў ініцыятыву па развіцці тэатральнага руху на Краснапольшчыне. З бюджэту былі выдзелены сродкі, што дапамагло ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу. Дзякуючы гэтаму з'явілася пэўная стабільнасць, жаданне тварыць... У 2016-м усе сілы аддалі рабоце над конкурсным праектам, прысвечаным захаванню тэатральных традыцый. Адначасова працавалі над праектам па ганчарстве. У выніку перамаглі і дзякуючы праекту «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН), атрымалі гранты «Тэатральныя вечарыны», выйшлі на новы ўзровень і змаглі прэтэндаваць на брэнд раёна. Сёлета фестываль упершыню праводзіўся па рашэнні райвыканкама і пры яго фінансавай падтрымцы. Мы змаглі купіць дэкаратыўную тканіну на сцэну, зрабіць падсветку, аплаціць харчаванне і пражыванне гасцей, арганізаваць для іх экскурсію па раёне. Але гэтыя грошы абавязкова акупяцца. Нашы дзеці займаюцца ў тэатральным гуртку раённага цэнтра культуры, і дастаткова адзін раз убачыць іх на сцэне, каб пераканацца, што за будучае нашага тэатра можна не перажываць.

### Знак якасці «ад народа»

Васіль Ткачоў — драматург запатрабаваны. Яго п'есы ідуць і ў беларускіх, і ў рускіх тэатрах. А вось з «народнікамі» з Краснаполля ён працаваў упершыню.

— Калі народны тэатр узяў маю п'есу, можна ганарыцца. Гэта знак якасці ад народа. Для мяне як драматурга гэта вельмі важна.

Трагікамедыя, якую выбралі краснапальчане, — «Лёгкі на ўспаміне» ставілася ў народных тэатрах Гродзеншчыны, Віцебшчыны, нават Харкава на Украіне. Ёсць у ёй тое, што кранае да глыбіні душы.

— П'есу для сёлетняга фестывалю выбіраў доўга, — прызнаецца



Аляксандр КУЗНЯЦОЎ, Васіль ТКАЧОЎ і Юрый ПАДАЛЯКІН (злева направа) — людзі, блізкія па духу.

**Аляксандр Кузняцоў, рэжысёр Краснапольскага народнага тэатра.** — І п'еса «Лёгкі на ўспаміне» зачапіла. Праблема адселеных вёсак, Чарнобыль — гэта ж усё пра нас. Шмат нашых вёсак пасля чарнобыльскай трагедыі знікла. Вёску, дзе нарадзіўся мой бацька і куды я ездзіў да бабулі, на жаль, бяда таксама не абмінула.

### Тэатральны перапалох

Кажуць, што пачуцці з часам становяцца менш вострымі і хвалюючымі. На артыстаў Краснапольскага народнага тэатра гэта не распаўсюджваецца. Іван Ткачоў, артыст са шматгадовым вопытам, перад прэм'ерай хваляваўся як школьнік:




З удзячнасцю ад драматурга.

— Тэатр настолькі глыбока ўвайшоў у мне сядзіць, што я ўжо не ведаю, калі я жыву, а калі іграю. У новым спектаклі ў мяне галоўная роля. Я ўвасабляю Сцяпана. Калі рэпеціраваў, сто патоў сыходзіла. А ў дзень прэм'еры прачнуўся і спужаўся, што слоў не памятаю!

**Юрый Падалякін, дырэктар Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Краснапольскага раёна,** адзін з натхняльнікаў тэатральнага руху на Краснапольшчыне.

— Сёлета ў нас паказвалі дзевяць спектакляў тэатраў з Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы. Дзякуючы ПРААНаўскаму праекту, леташні фестываль дастаткова нашумеў, — кажа ён. — Екацярынбург і Гатчына, напрыклад, завіталі другі раз. Прычым за свой кошт. Мы забяспечваем толькі пражыванне і харчаванне. Білет на фестывальны спектакль каштаваў усяго 2—3 рублі. Але, як прызнаюцца арганізатары, у накладзе яны не засталіся, бо быў, як той казаў, поўны аншлаг.

Адна з праблем — пражыванне для іншагародніх. На фестываль збіраецца шмат людзей. Некаторых прыйшлося пасяліць у суседнім Чэрыкаве. Тутэйшым прадпрымальнікам трэба ўзяць на заметку, што раёну неабходна, напрыклад, аграсядзіба пад умоўнай назвай «Тэатральная». Фестываль з'яўляецца брэндам для Краснапольскага раёна, таму трэба трымаць імідж.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Старшыня Краснапольскага райсавета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН:**

— Для нас, дэпутатаў, прасоўванне ініцыятыў, праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі — адна з альтэрнатыўных крыніц павышэння эфектыўнасці рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці. Наша задача — дапамагаць ствараць спрыяльныя ўмовы для жыхароў. Зрабіць гэта за кошт мясцовых бюджэтаў не заўсёды атрымліваецца. Праектная дзейнасць, арганізаваная ў рамках конкурсаў з прыцягненнем замежных грантавых сродкаў, пасяхова садзейнічае развіццю тэрыторыі. За чатыры гады ўдзела ў ёй раён атрымаў грантаў на суму больш за 115 тысяч долараў і 88 тысяч еўра.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 21 чэрвеня 2018 года.**